ГУК «Шарковщинская ЦБС»
Отдел библиотечного маркетинга

# Мы – молодые – надежда страны



Молодёжь во все времена считалась самой перспективной и важной группой общества. Именно за ней традиционно закрепляют статус «будущее страны». Если буквально понимать такое отношение к молодому поколению, то ответственность на нее возлагается немалая. Так, будущее Беларуси во всех отношениях будет зависеть от активности, развитости, образованности молодёжи и многих других качеств, присущих здоровому обществу, и отдельной личности. Поэтому сегодняшняя молодёжь играет ключевую роль в формировании и деятельности гражданского общества.

Если хочешь жизнь прожить красиво
И оставить в этой жизни след,
Не живи лениво и тоскливо.
Жизнь одна – другой у тебя нет!
А ты молодой и талантливый ты,
У тебя есть идеи, у тебя есть мечты
В союз молодёжи приходи поскорей,
Найдёшь ты себя и надёжных друзей.
Мы – молодые – надежда страны!
Традициям предков всегда верны!
Мы – молодые, одна семья!

## Старонкі гісторыі

У маі 1940 года ў вёсцы Полава Шаркаўшчынскага раёна створана пярвічная камсамольская арганізацыя. Першымі яе камсамольцамі сталі перадавыя юнакі і дзяўчаты Полаўскага сельскага Савета – Генадзь Лысёнак, Віталь Райчонак, Сямён Латыш, Іосіф Гінько, Марыя Януш, Ксенія Касарэўская, Міхаіл Сікора, Лявон Аляхновіч. Мікалай Райчонак, Фёдар Мурзёнак. Сакратаром яе быў выбраны энергічны 19-гадовы Генадзь Лысёнак, які ў той час быў загадчыкам паштовага аддзялення ў вёсцы Полава.Даволі вялікая па таму часу камсамольская арганізацыя з 18 камсамольцаў была створана ў суседняй вёсцы Рымкі. Узначальваў яе непаседлівы і вясёлы Ананій Невядомскі.

Аналагічныя камсамольскія арганізацыі былі створаны ў блізляжачых вёсках Белькі, Пятровічы, Агальніца, Тузбіца, Дубрава, Кушталі, Жданы і некаторых іншых.

У 1940 годзе праведзена першая раённая камсамольская канферэнцыя. Членам бюро райкома камсамола быў выбраны і сакратар Полаўскай пярвічнай арганізацыі Генадзь Лысёнак. Да таго часу ён быў дэпутатам раённага Савета і назначаны старшынёй Шаркаўшчынскага камітэта па справах фізкультуры і спорту.

Аднак кароткім было новае жыццё. У выніку нападу фашысцкай Германіі Шаркаўшчынскі раён быў заняты фашыстамі. Пачаліся масавыя рэпрэсіі. Яны перш за ўсё скіроўваліся супраць партыйных і савецкіх работнікаў, камуністаў і камсамольцаў. У гэты час былі расстраляны на Полаўшчыне сакратар камсамольскай арганізацыі вёскі Рымкі Ананій Невядомскі, камсамольцы Уладзімір Бабылёнак і Сямён Латыш. Стварыўшаяся сітуацыя і абмяркоўвалася вечарам 27 чэрвеня 1941 года камсамольцамі непадалёку ад вёскі Агальніца Малая. Сустрэчу арганізаваў Генадзь Лысёнак. На ёй прысутнічалі Іосіф Гінько, Эма Бараноўская, Эдмунд Кухальскі, Сяргей Дзіковіч і іншыя. Было прынята рашэнне назваць Полаўскую падпольную камсамольскую арганізацыю “За Радзіму”. У штаб арганізацыі выбралі Генадзя Лысёнка, Іосіфа Гінько, Сяргея Дзіковіча. Сакратаром стаў Генадзь Лысёнак. Камсамольцы-падпольшчыкі наладжвалі дзейсную сувязь не толькі з ваеннапалоннымі, яны вялі агітацыйную работу сярод камсамольцаў і моладзі вёсак Полава, Пятровічы, Агальніца Малая, Рымкі, Невядомшчына, Сямёнавічы, Жукоўшчына, Алашкі і іншыя.

У кастрычніку 1941 года ў вёсцы Рымкі адбыўся другі сход падпольнай камсамольскай арганізацыі “За Радзіму”. Гэтым сходам было закончана яе арганізацыйнае афармленне. Тактыка барацьбы засталася ранейшай: сбор зброі, падрыхтоўка да партызанскай барацьбы, расшырэнне і ўмацаванне радоў падпольшчыкаў.

1 верасня 1943 года быў зацверджаны састаў Шаркаўшчынскага падпольнага райкома камсамола. У яго ўвайшлі камсамольцы-партызаны, камсамольцы-падпольшчыкі. Першым сакратаром зацверджаны Генадзь Лысёнак, другім – Павел Пілецкі, членамі РК ЛКСМБ Іосіф Гінько. Мікалай Смірноў, Алена Ціхамірава, Аляксандра Пілюшэнка, Фёдар Шэндаў, Іван Зяленскі. Інструктарамі РК ЛКСМБ сталі члены камсамольскай арганізацыі “За Радзіму” Іосіф Гінько і Пётр Балай. Фармальна лічыцца, што падпольная камсамольская арганізацыя “За Радзіму” дзейнічала да 1 верасня 1943 года, гэта значыць да стварэння падпольнага РК ЛКСМБ. З дапамогай падпольнага Шаркаўшчынскага райкома партыі ў верасні 1943 года падпольны райком ЛКСМБ ствараў ў атрадзе камсамольскія арганізацыі.

“З верасня 1943 года па 1 студзеня 1944 года прынята ў камсамол – 39 чалавек, адноўлена ў камсамоле – 14 чалавек, рэкамендавана камсамольцаў у партыю – 5, прадстаўлена да дзяржаўнай узнагароды – 19 камсамольцаў, загінуўшых у баі няма”. Такая кароткая справаздача была адаслана падпольнаму абкому камсамола.

У студзені 1944 года ў брыгаду прыбыў першы сакратар Вілейскага абкома камсамола Пётр Міронавіч Машэраў. Ён пабываў у кожнай камсамольскай арганізацыі атрадаў, прысутнічаў на пасяджэнні райкома камсамола, сустракаўся з падпольшчыкамі.

Вясной 1944 года пачала выходзіць падпольная газета “Народны мсціўца”. Рэдактарам яе быў зацверджаны камсамолец, начальнік штаба брыгады “За Радзіму” Канстанцін Капцюгоў.

**Камсамольцы – перадавікі калгаса**

Свята выконваюць камсамольцы калгаса «17 верасня» запатрабаванні Статута – ажыццяўляць авангардную ролю на вытворчасці. У калгаснай арганізацыі валічваецца 37 камсамольцаў і ўсе яны добра працуюць, моцна ўтрымліваюць першынство ў сацыялістычным спаборніцтве не толькі сярод хлебаробаў свайго калгаса, а і раёна.

Узяць, напрыклад, камсамолку даярку Марфу Пятрову. Пяць год яна занята на калгаснай ферме і за тэты час зарэкамендавала сябе як добрасумленная працаўніца, спецыяліст-жывёлавод. За высокія надоі малака, атрыманыя ёй ад замацаваных кароў у мінулым годзе, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. Пятрова ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Яшчэ лепш стала працаваць камсамолка пасля высовай урадавай узнагароды. 3 пачатку бягучага года яна надаіла 3.686 літраў малака ад каровы. Па надоях М. Пятрова займае першае месца сярод даярак раёна.

- Сваё абавязацельства надаіць 4 тоны малака ад каровы, – заяўляе тав. Пятрова, – я перакрыю.

- Наша Марфа, – з любоўю заяўляюць калгаснікі, – слова сваё стрымае. Можна быць упэўненым.

Не горш працуе яе сяброўка – камсамолка Анна Пятрашка. Дзяўчына старанна даглядае жывёлу. Яна забяспечвае належны догляд, добра корміць кароў, прыкладае ўсе свае сілы і веды, каб дабіцца высокіх надояў. Праца яе не прападае дарэмна. Малады жывёлавод займае адно з першых месц у спаборніцтве сярод даярак раёна. 2.916 кілаграмаў малака ад каровы за 10 месяцаў – такі вынік яе добрасумленнай працы.

Добра адклікаюцца члены сельгасарцелі і аб даярцы Наталлі Шчукінай.

Маладыя, працавітыя рукі ў нашай камсамолкі даяркі Наталлі. Такіх бы работнікаў на ферму пабольш. Праўда, Наталля яшчэ не стаіць у першым дзесятку лепшых даярак раёна, але можна спадзявацца, што яна будзе займаць падабаючае ёй месца. На днях васакародная праца даяркі была адзначана Граматай райкома камсамола.

Зінаіда Калінка спаборнічае з Рыпінай Осіпавай. Сяброўкі стараюцца не адстаць адна ад другой па надоях малака. Яны і дапамагаюць адна другой у працы вопытам і справай. Як вынік, жывёлаводы набліжаюцца ўжо да выканання ўзятых на сябе сацыялістычных абавязацельстваў.

Нягледзячы на асенні перыяд, даяркі Анфіса Андрэева і Моніка Бучынская захоўваюць параўнаўча высокія надоі малака ад замацаваных за імі кароў. Яны дабіліся гэтага дзякуючы добраму догляду жывёлы, кармлення, дакладнаму захаванню распарадку дня на ферме.

Працоўныя поспехі ў калгасе ў многім залежаць ад механізатараў, ад таго, як яны працуюць.

Нельга сказаць дрэннага слова аб маладых трактарыстах, камсамольцах, братах Васілю і Антону Калінка. Працуючы на трактары “Беларусь”, яны забяспечваюць выкананне і перавыкананне норм на ўздыме зябліва, здаюць работу толькі добрай якасці. Красіць камсамольцаў і тое, што тэхніку яны любяць, беражліва адносяцца да яе.

Добра працуе механізатар Альбін Бездзель на трактары «ДТ-54».

Уперадзе спаборнічаючых паляводаў-камсамольцаў ідуць Іван Зубаў, Тадэуш Чарневіч, Тамара Бяспальчык, Зоя Язёнак, Зінаіда Табар і многі другія.

Нашы камсамольцы не падвядуць, – адклікаюцца аб іх брыгадзіры паляводчых брыгад.

Так яно і ёсць. Якую б ім работу не даручылі, заўсёды яна выконваецца хутка якасна.

Добры прыклад камсамольцаў у працы, іх ініцыятыва робіць станоўчы ўплыў і на астатнюю калгасную моладзь. Не адстаюць ад членаў ВЛКСМ і маладыя жывёлаводы, паляводы і другія спецыялісты. Яны таксама. спаборнічаюць паміж сабой, стараюцца дагнаць лепшых, дабіцца высокіх паказчыкаў у працы.

Здавалася б, што лёгкую працу выбрала сабе Антаніна Захарава – учотчык па малаку. Але гэта не так. Дзяўчына не лічыцца з часам, робіць усё, каб забяспечыць правільны ўлік паступаючай прадукцыі. І гэтага яна дабілася.

Камсамольцы і несаюзная моладзь цяпер, у перадсвяточныя дні, з падвоенай энергіяй працуюць на сваіх участках. Яны імкнуцца слаўнымі працоўнымі падарункамі сустрэць вялікае нацыянальнае свята ўсяго савецкага народа – 41-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Кожны дзень імі азнамяноўваецца новымі добрымі справамі на карысць далейшага развіцця свайго калгаса

Так працуюць у калгасе камсамольцы і несаюзная моладзь. Працуюць самааддана, з запалам. Вось чаму добрая слава ідзе аб іх у нашай сельгасарцелі.

**Л. Казлоўская,**
**сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса «17 верасня»**

**Урачысты пленум райкома камсамола, прысвечаны 40-годдзю ВЛКСМ**

28 кастрычніка, напярэдадні свайго вялікага свята – 40-годдзя камсамола, у раённым кінатэатры “Перамога” сабраліся члены райкома камсамола, лепшыя работнікі вытворчасці, камсамольцы. На ўрачысты пленум прыбылі таксама камуністы, многія з якіх не адзін год правялі ў падполлі ў барацьбе з рэакцыйным рэжымам панскай Польшчы, з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У прэзідыум пленума пад апладысменты прысутных выбіраюцца старэйшыя камуністы, камсамольскія работнікі, передавая калгасная моладзь. З дакладам “40 год ВЛКСМ” выступае сакратар райкома ЛКСМБ т. Рабіза. Ён падрабязна расказвае аб стварэнні камсамола, яго слаўным баявым шляху, адзначаным пяццю ордэнамі Савецкага Саюза.

Неўвядальнай славай пакрылі сябе камсамольцы Шаркаўшчыны ў перыяд часовай акупацыі гітлераўскімі захопнікамі раёна, – гаворыць т. Рабіза. Далей ён прыводзіць шмат прыкладаў геразма камсамольцаў, якія змагаліся супраць акупантаў.

Аб слаўных працоўных справах камсамольцаў і ўсёй моладзі раёна расказвае ён у канцы свайго даклада. Апладысментамі і агульным адабрэннем сустракаюць прысутныя яго запэўніванне роднай Камуністычнай партыі, што камсамольская арганізацыяраёна заўсёды і ва ўсім будзе памочнікам і рэзервам партыі.

Даклад закончан. З рапартамі аб працоўных перамогах камсамольцаў выступаюць сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса імя Леніна Яніна Лаўрыновіч, сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса “За высокі ўраджай” Раіса Цітовіч і другія.

З успамінамі аб падпольнай рабоце шаркаўшчынскіх камсамольцаў і моладзі ў гады акупацыі выступілі старшыня калгаса імя Сталіна Корніцкага сельсавета т. Танканог і рабочы РТС т. Лаўрыновіч.

Раздаецца горн. Гэта піянеры ўваходзяць у залу вітаць сваіх старэйшых таварышаў – камсамольцаў з слаўным саракагоддзем.

Многа слаўных спраў робяць камсамольцы і моладзь раёна і цяпер. Гэта яны горача адгукнуліся на заклік партыі працаваць на жывёлагадоўчых фермах, гэта яны памнажаюць багацці арцелі. І вось сёння на пленуме лепшых з лепшых уручаны пераходныя вымпелы райкома камсамола. Заслужана Ганаровыя граматы ўручаюцца передавым даяркам, свінаркам і другім работнікам калгаснай вытворчасці.

Пленум закончан. У заключэнне сіламі мастацкай самадзейнасці Шаркаўшчынскай моладзі быў дан вялікі канцэрт.

**Радаснае свята**

У камсамольскай арганізацыі калгаса імя Жданава адбыўся сход, прысвечаны 40-годдзю Ленінскага камсамола. З дакладам «40 год ВЛКСМ» выступіла тав. Курыловіч. Яна падрабязна застанавілася на поспехах, дасягнутых камсамольцамі краіны і камсамольскай арганізацыяй калгаса.

У дакладзе т. Курыловіч адзначыла, што пры актыўнай працы камсамольцаў і моладзі дасягнуты значныя поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі. Сёлета ў параўнанні з мінулым годам намнога павысілася ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Дасягнуты поспехі і ў развіцці грамадскай жывёлагадоўлі, павышэнні яе прадуктыўнасці. За 9 месяцаў бягучага года калгасам выткарана 127,7 цэнтнера малака на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. Выхад мяса на 100 гектараў сельгасугоддзяў складае 26,8 цэнтнера, у тым ліку 11,5 цэнтнера свініны.

З прывітальным словам ад партыйнай арганізацыі калгаса выступіў член КПСС, старшыня калгаса тав. Зянок.

Потым лепшым камсамольцам і моладзі, якія сваей асабістай працай прынеслі многа карысці калгасу і Радзіме, былі ўручаны Пахвальныя лісты.

Для камсамольцаўі калгаснай моладзі быў дан канцэрт.

Вечар прайшоў весела і цікава.

## Справы камсамольцаў раёна

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар дастойнай сустрэчы 40-годдзя ВЛКСМ, раённая камсамольская арганізацыя падыйшла да свайго юбілею маналітнай і згуртаванай.

Цяпер на фермах калгасаў працуюць 240 чалавек моладзі, сярод іх 99 членаў ВЛКСМ. У калгасах «17 верасня», «Чырвоны сцяг», імя Леніна, «Герой працы» і другіх жывёлагадоўчыя фермы абслугоўваюцца поўнасцю камсамольцамі і моладдзю.

Да свайго юбілею больш 20 маладых даярак надаілі звыш 2.100 кілаграмаў малака ад кожнай каровы. Яны ўжо перавыканалі свае абавязацельствы. Лепшыя камсамолкі маладзёжнай фермы калгаса «17 верасня» Марфа Пятрова, Марыя Адамовіч, Ангеліна Пятрашка надаілі за 9 месяцаў па 3.285 – 2.499 кілаграмаў малака на адну фуражную карову. Не адсталі ад іх і свінаркі. Лепшых вынікаў сярод іх дабіліся Яўгенія Боднева, Глафіра Лагун, Таццяна Піваварава з саўгаса «Шаркаўшчынскі», Марыя Савіцкая з калгаса «Іскра», Ядзвіга Хаданёнак з калгаса «Свабода», Феонія Міхайлава з калгаса імя Чапаева, якія адкармілі ад 300 да 400 галоў свіней кожная.

Сустракаючы 40-годдзе ВЛКСМ, камсамольцы і моладзь раёна многа зрабілі па стварэнню кармавой базы для грамадскай , жывёлагадоўлі. У гэтым лепшых вынікаў дабілася кукурузаводчае звяно камсамолкі Веранеі Карман з калгаса імя Сталіна Буйкаўскага сельсавета, якое на плошчы ў 8 га атрымала ўраджай зялёнай масы па 750 цэнтнераў з кожнага гектара. Звяно Міхаіла Буйка з калгаса імя Леніна на пяцігектарнай плошчы атрымала таксама па 750 цэнтнераў зялёнай масы з гектара.

Маладыя механізатары добра папрацавалі ў час веснавой сяўбы, уборкі ўраджаю і сяўбы азімых культур.

Значна папоўніліся рады камсамола. За 9 месяцаў бягучага года ў камса- мол уступіла 212 чалавек перадавой моладзі.

Свае працоўныя поспехі камсамольцы прысвячаюць 40-гадоваму юбілею камсамола і нечарговаму XXI з’езду КПСС.

**Г. Рабіза,**
**сакратар РК ЛКСМБ**

***

24 верасня 1960 года спаўняецца 40 год з дня склікання 1-га Усебеларускага з’езда камсамола, на якім была завершана вялікая работа па стварэнню Камуністычнага Саюза моладзі Беларусі.

Камсамол Беларусі стаў надзейным памочнікам і рэзервам партыі. У гады грамадзянскай вайны камсамольцы лічылі сваім свяшчэнным абавязкам абараняць савецкую ўладу, мужна змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах.

Пасля заканчэння вайны ўся работа камсамола была падпарадкавана задачы аднаўлення народнай гаспадаркі, арганізацыі вучобы і выхавання моладзі. Прамова Уладзіміра Ільіча Леніна на III з’ездзе камсамола з’явілася пуцяводнай зоркай для камсамола.

У цяжкіх умовах аднаўленчага перыяду камсамол Беларусі вырас і ўзмужнеў. Калі ў 1920 годзе ў яго радах налічвалася 3 тысячы членаў, то ў 1926 годзе – 36 тысяч. У чэрвені 1924 года VII з’езд камсамола Беларусі прыняў прапанову аб прысваенні камсамолу імя Леніна.

У гады індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі камсамольскім арганізацыям прыйшлося трымаць сур’ёзны экзамен на працоўным фронце. Толькі за 1928-30 гг. на новабудоўлі першай пяцігодкі пайшло па камсамольскай мабілізацыі 15 тысяч камсамольцаў Беларусі.

Камсамол аказаў вялікую дапамогу партыі не толькі ў будаўніцтве новых прадпрыемстваў, але і ў асваенні тэхнікі, у барацьбе за павышэнне прадукцыйнасці працы. Ён аказаў велізарную дапамогу і ў падтрымцы маладых кадраў рабочага класа і інтэлегенцыі.

Актыўны ўдзел прынялі камсамольцы Беларусі ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Першыя сельскагаспадарчыя кааператывы былі створаны камсамольцамі. Яны з’яўляліся на вёсцы праваднікамі палітыкі партыі, барацьбітамі за новае жыццё.

Камсамол Беларусі дабіўся ў перадваенныя гады вялікіх поспехаў у выхаваўчай рабоце сярод моладзі. Вераломны напад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на нашу Радзіму спыніў мірную працу савецкага народа. Для камсамола Беларусі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне з’явіўся самай гераічнай старонкай. У першыя дні вайны больш палавіны ўсіх камсамольцаў пайшлі ў рады Савецкай Арміі, атрады народнага апалчэння, знішчальныя атрады.

**У падарунак з’езду**

Стала добрай традыцыяй савецкай моладзі сустракаць знамянальныя падзеі ў жыцці нашай краіны працоўнымі падарункамі. Праз некалькі дзён распачынае сваю работу XIV з’езд Ленінскага камсамола – з’езд маладых будаўнікоў камунізма.

Камсамольцы і моладзь камбіната бытавога абслугоўвання ў гонар з’езда ўзялі абавязацельства датэрмінова выканаць квартальны план значна палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі, знізіць яе сабекошт.

Сваё слова камсамольцы і моладзь стрымалі. Дзякуючы іх стараннай працы камбінат выканаў план выпуску валавой прадукцыі на 118,8 працэнта, таварнай — на 150. Прадукцыйнасць працы ў першым квартале гэтага года ўзрасла на 12 працэтаў супраць леташняга. Лепшых вынікаў у сацыялістычным спаборніцтве дабіліся швеі Марыя Гардзіёнак, Ліда _Скурат, Вольга Далецкая, Іна Ананіч, шаўцы Ананій Лысёнак, Аляксандр Гімбар. Усе яны выконваюць зменныя нормы на 125—140 працэнтаў.

Працу камсамольцы і моладзь спалучаюць з актыўным удзелам у грамадскім жыцці. Іван Сапранёнак адказвае за выпуск насценнай газеты, Інна Ананіч, Генадзь Бацвінёнак, Мікола Латышонак з‘яўляюцца актыўнымі членамі добраахвотнай пажарнай дружыны. Усе камсамольцы наведваюць палітгурток, дзе яны вывучаюць матэрыялы XXII з’езда КПСС.

**В. Машэкіна,**
**сакратар камсамольскай арганізацыі камбіната**
**бытавога абслугоўвання**

**Ідэйная загартоўка моладзі**

*Прайшло больш трох месяцаў, як у сістэме камсамольскай палітасветы пачалася вучоба. Аб тым, што сёлета новага і якая своеасаблівасць у правядзенні заняткаў, расказвае першы сакратар РК ЛКСМБ Уладзімір Сувораў.*

Адным з асноўных участкаў работы камсамол заўсёды лічыў і лічыць павышэнне агульнаадукацыйнага і палітычнага ўзроўню моладзі, яе ідэйную загартоўку, фарміраванне ў юнакоў і дзяўчат марксісцка-ленінскага светапогляду.

Прайшло нямногім больш трох месяцаў з дня пачаткузаняткаўу сістэме камсамольскай палітасветы. Чым жа вызначаецца гэты навучальны год, што змянілася ў пастаноўцы палітычнай вучобы моладзі ў параўнанні з 1967 -1968 годам? Трэба адзначыць, што сёлета ў раёне створанана 5 гурткоў камсамольскай палітасветы, больш, чым было ў папярэднім годзе. Цяпер іх налічваецца 29, у якіх займаецца 473 члены ВЛКСМ, 210 чалавек навучаюцца ў сістэме партыйнай палітасветы. Усімі формамі вучобы ахоплена больш дзвюх тысяч камсамольцаў.

Змянілася і структура камсамольскай палітасветы, назіраецца цяга моладзі да вывучэння гісторыі ВЛКСМ, гісторыі КПСС, біяграфіі У. І. Леніна. Калі ў мінулым годзе перавагу меў гурток «Кругагляд», то сёлета гурткі па праграмах «Біяграфія У. І. Леніна», «Наш Ленінскі камсамол», «Гутаркі аб партыі», працуюць 4 семінары па праграме «Моладзь і грамадскі прагрэс».

Некалькі змяніўся і састаў прапагандысцкіх кадраў. З моладдзю працуюць больш вопытныя, маючыя вялікі стаж прапагандысцкай работы камуністы. У 12 з іх прапагандысцкі стаж больш двух-трох гадоў. Усё гэта дазволіла палепшыць якасць палітычнай вучобы камсамольцаў.

Нядрэнна, напрыклад, пастаўлена работа гурткоў камсамольскай палітасветы ў калгасах імя Фрунзе (прапагандыст Фёдар Русецкі), «1-е Мая» (прапагандыст Ядзвіга Жук), саўгасе імя Маркава (прапагандыст Уладзімір Раслевіч).

Добра прайшлі апошнія семінарскія заняткі камсамольцаў калгаса імя Фрунзе, якія займаюцца па праграме «Моладзь і грамадскі прагрэс». Тэма заняткаў: «Сацыялістычныя вынікі культурна-тэхнічнай рэвалюцыі пры сацыялізме і капіталізме». Камсамольцы прыйшлі на заняткі роўна ў 18 гадзін, як і намячалася. Пачаліся яны з палітінфармацыі па бягучых пытаннях міжнароднага жыцця, з якой выступілі слухачы М. Закрэўская, С. Шэўчык. Потым прапагандыст Фёдар Русецкі паставіў рад пытанняў па вывучанай тэме. Добра адказвалі на пастаўленныя пытанні. Заняткі скончыліся каля 20 гадзін. Слухачы разыйшліся па дамах пад вялікім уражаннем.

Такі ж семінар створаны і пры пярвічнай камсамольскай райвыканкома (прапагандыст М. Кавалеўскі). Трэба адзначыць, што сакратар камсамольскай арганізацыі Л. Кухальская і стараста групы Р. Мацкевіч сур’ёзна адносяцца да падрыхтоўкі заняткаў. У мінулы панядзелак усе слухачы прыйшлі роўна ў назначаны час.

Але, калі арганізацыйныя пытанні вырашаюцца паспяхова, то якасць заняткаў пакідае жадаць лепшага. Вывучаемая тэма “Асоба і сацыяльныя сістэмы” вельмі цікавая. Аднак у слухачоў яна не знайшла. жывога водгуку, не было патрэбнага энтузіязму ў абмеркаванні пастаўленых пытанняў, не гаворачы ўжо аб спрэчцы, якая паяўляецца заўсёды, калі што-небудзь няяснае высвятляецца. Здарылася гэта таму, што на вывучаемую тэму ў прапагандыста і слухача не было прыкладаў з жыцця раёна.

Палітычная асвета моладзі – гэта важны і адказны ўчастак камсамольскай работы. Яе значэнне ўзрастае асабліва цяпер, на сучасным этапе, калі ў свеце ідзе непрымірымая барацьба дзвюх ідэалогій, барацьба за розум людзей, а першую чаргу за розум і сэрцы моладзі. Аб гэтым мы павінны заўсёды памятаць.

**У. Сувораў,**
**Першы сакратар РК ЛКСМБ**

## Па-ударнаму

Гарачы водгук у сэрцах маладых працаўнікоў раёна знайшоў заклік раённага камітэта камсамола аб правядзенні камсамольскага суботніка ў гонар 65-й гадавіны з дня нараджэння камсамола. Сотні юнакоў і дзяўчат працавалі ў мінулую суботу па-ударнаму, па-камсамольску.

Выконвалі розныя работы. Многія, у прыватнасці, камсамольцы гароднінасушыльнага завода, раённага камбіната бытавога абслугоўвання, калгасаў і саўгасаў працавалі на сваіх рабочых месцах.

Не засталася без увагі моладзі і падшэфная будоўля – жывёлагадоўчы комплекс у калгасе «Маяк». 65 чалавек з райпа, райбальніцы, райсельгастэхнікі, райсельгасхіміі, ПМК-51, прыбылі на аб’ект. каб дапамагчы будаўнікам МПМК-39 своечасова закончыць запланаваныя работы. І зрабілі нямала. Ачысцілі і выраўнялі выгульныя пляцоўкі, падрыхтавалі да здачы памяшканні цялятнікаў.

**Ю. ДУБОЎСКІ,**
**загадчык арганізацыйнага аддзела райкома камсамола**

**Ленінскай партыі мы рапартуем: працягваем лепшыя традыцыі**

Нямала добрых спраў на рахунку камсамольскай арганізацыі калгаса імя Гагарына. Яна разам з камуністамі, усімі хлебаробамі гаспадаркі ўносіць дастойны ўклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы. На працягу шасці год камсамольскую арганізацыю ўзначальвае Зоя Рагачэўская. Напярэдадні раённай справаздачна-выбарнай канферэнцыі з ёй гутарыў карэспандэнт.

- Зоя, с якімі пачуццямі Вы выязджаеце на канферэнцыю?

- Справаздачны перыяд азнаменаваўся значнымі поспехамі ў жыцці пярвічнай камсамольскай арганізацыі. Дарэчы, узрасла камсамольская арганізацыя і колькасна. Павялічыўся атрад механізатараў. Нашы камсамольцы добра папрацавалі над выкананнем заданняў адзінаццатай пяцігодкі. Асабліва плённым стаў чацвёрты год пяцігодкі. У калгасе дасягнута высокая ўраджайнасць – па 30 цэнтнераў збожжа з гектара. Безумоўна, у гэтым заслуга і камсамольцаў. У ліку правафланговых трактарыст Генадзь Салачонак. Дарэчы, Генадзь сёлета прызначалі ў цэхавую камсамольскую арганізацыю. Гордасцю калгаса з’яўляецца і камбайнер Вячаслаў Катовіч. Сёлета на ўборцы ён заняў першае месца сярод камсамольцаў гаспадаркі. Добра працуе і нядаўні выпускнік Глыбоцкага СПТВ Валянцін Ясюкевіч. У ліку перадавікоў і шафёр Міхаіл Паўлаў. Менавіта такія прадстаўнікі моладзі з гонарам працягваюць лепшыя працоўныя традыцыі сваіх бацькоў.

- Як вядома, Вы ўжо значны час узначальваеце камсамольскую арганізацыю, а некалькі гадоў назад сталі членам КПСС. Які ўплыў зрабіла гэта на Вашу працу, на Ваша кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй?

- Гэта вялікі гонар быць членам партыі і працаваць у камсамоле. І не толькі гонар, але і павышаная адказнасць. Узрасла патрабавальнасць, у першую чаргу, да сябе, да сваёй работы, яшчэ больш цеснай стала сувязь з пярвічнай партыйнай арганізацыяй. А гэта, як вядома, залог поспехаў. Мая асноўная работа – бібліятэкар. Каб лепш працаваць, неабходна пастаянна вучыцца. У гэтым годзе стала студэнткай-завочніцай Мінскага інстытута культуры. Бібліятэка, дзе я працую, прымала сёлета актыўны ўдзел у рэспубліканскім конкурсе «Зямля і кніга», што дазволіла значна лепш наблізіць кнігу да чытача. На буйных жывёлагадоўчых комплексах дзейнічаюць пункты кнігавыдачы. Словам, стараюся быць вернай гэтаму даверу.

- НаУсеармейскай нарадзе сакратароў камсамольскіх арганізацый Генеральны сакратар ЦК КПСС К. У. Чарненка гаварыў пра задачы, якія стаяць перад камсамолам, у тым ліку і сельскім. Як ваша камсамольская арганізацыя, кожны камсамолец ажыццяўляюць намечанае партыяй?

- Наш паўсядзённы дэвіз – ісці наперад за камуністамі, быць працавітымі, патрыётамі сваёй Радзімы, памнажаць багацце роднай зямлі. Словы мы пастаянна падмацоўваем канкрэтнымі справамі. Кожны камсамолец узяў сацыялістычнае абавязацельства выдатнымі працоўнымі падарункамі сустрэць 40-годдзе Вялікай. Перамогі і XXVII з’езд КПСС.

**Справамі мір на планеце мацуем!**

Зусім нядаўна вярнуўся з турыстычнай паездкі па Народнай Рэспубліцы Балгарыі механізатар Пётр Кабак. Пуцёўка яму была прадастаўлена як лепшаму камбайнеру гаспадаркі. А папрацаваў камсамолец на сёлетнім жніве добра: убраў зерневыя з плошчы 158 гектараў і намалаціў 405 тон збожжа Юнакі і дзяўчаты калгаса «Вялікае Сяло» выбралі Пятра Кабака дэлегатам раённай справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі



## Пленум райкома камсамола

Адбыўся VII Пленум райкома камсамола. З дакладам “Аб работе камсамольскіх арганізацый раёна, якія вынікаюць з патрабаванняў чэрвеньскага (1986 г.) Пленума ЦК КПСС” выступіў другі сакратар райкома камсамола П. Гарбуз.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел сакратар камсамольскай арганізацыі аўтамеханік калгаса імя Кутузава У. Недзведзь, машыніст экскаватара ПМК-51 П.Бурэль, сакратар камсамольскай арганізацыі, электрык Шаркаўшчынскага філіяла Браслаўскага вытворчага аб’яднання будаўнічых матэрыялаў К.Андруковіч, сакратар камсамольскай арганізацыі Іёды тэрытарыяльныя, настаўнік Іёдскай сярэдняй школы А.Траба.

“Аб правядзенні XXIII раённай справаздачна-выбарнай канферэнцыі” – з такім пытаннем выступіў другі сакратар райкома камсамола П.Гарбуз.

Разгледжана арганізацыйнае пытанне. Пленум вызваліў ад абавязкаў першага сакратара камсамола Г. Дубоўскага ў сувязі з пераходам на партыйную работу. Першым сакратаром райкома камсамола выбран П. Гарбуз.

Другім сакратаром райкома камсамола выбран І.Іваноў, які раней працаваў старшынёй райспорткамітэта.

У сувязі з пераходам на другую работу ад абавязкаў сакратара райкома камсамола вызвалена А. Корсак.

Сакратаром райкома камсамола выбрана Т. Рымдзёнак.

Загадчыкам арганізацыйнага аддзела райкома камсамола зацверджан А. Рымчонак.

У рабоце Пленума райкома камсамола прынялі ўдзел і выступілі другі сакратар райкома партыі М.М. Марозаў і сакратар абкома камсамола У. Дуброўскі.

## Ёсць такая арганізацыя – БПСМ

*(з успамінаў А. Кукуця, начальніка аргаддзела РК БПСМ)*

Ва ўмовах дэмакратыі кожны чалавек сам вырашае, у якую грамадскую арганізацыю яму ўступаць. У нашай рэспубліцы ёсць нямала розных партый і рухаў, дзе кожны можа рэалізаваць свае здольнасці і навыкі. Для актывізацыі маладзёжнага руху быў створаны Беларускі патрыятычны саюз моладзі.

Яго асноўнай мэтай з'яўляецца аб'яднанне патрыятычна настроеных юнакоў і дзяўчат для абароны іх правоў і законных інтарэсаў, для актыўнага ўдзелу ў пабудове грамадства, сацыяльнай справядлівасці і прагрэсу, фарміраванне ў маладзёжным асяродку светапогляду, заснаванага на хрысціянскіх духоўна-маральных каштоўнасцях.

Відавочна, што ёсць надзённая патрэба мець такую арганізацыю, якая б на самай справе абараняла правы і інтарэсы моладзі. Таму варта падумаць аб тым, ці быць нам разам і разам дабівацца сваіх мэтаў або заставацца па аднаму і спадзявацца на выпадак. Наша сіла ў нашым адзінстве. Мы павінны быць разам, і толькі тады абаронім нашы законныя правы. Аднак гэты саюз нельга разглядаць, як даючы выгаду каму-небудзь аднаму. Усе члены саюза моладзі могуць прымаць удзел у яго рабоце і сумеснымі намаганнямі дабівацца пастаўленных мэтаў.

У нашым раёне ў кожным калгасе, саўгасе, у арганізацыях і школах створаны ячэйкі БПСМ, і кожны можа туды звярнуцца і прыняць удзел у рабоце саюза. Кожны малады чалавек ва ўзросце ад 14 да 35 гадоў мае поўнае права ўступаць у БПСМ.

Гэта маладзёжная арганізацыя будзе стымуляваць ідэі і ініцыятыўныя рашэнні яе членаў, займацца патрыятычным выхаваннем і арганізацыяй культурнага адпачынку моладзі, яе сацыяльнай абароны. Раённая арганізацыя БПСМ будзе ўстанаўліваць і падтрымліваць кантакты з фірмамі, якія займаюцца працаўладкаваннем моладзі ў бліжнім і далёкім замежжы; дабівацца ўключэння ў калектыўныя дагаворы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, гаспадарак раёна раздзела “Моладзь”, які б прадугледжваў выдзяленне фінансавых і матэрыяльных сродкаў на рэалізацыю сацыяльна значных ініцыятыў моладзі і аплату работы сакратара пярвічнай арганізацыі БПСМ. Плануецца стварыць банк дадзеных па прафесіях, якія карыстаюцца павышаным попытам на рынку працы; сумесна з райваенкаматам устанавіць шэфскія сувязі з вайсковымі часцямі і правесці раённую ваенна-патрыятычную гульню “Арсенал”; сумесна з аддзелам па справах моладзі райвыканкама і аддзелам па фізкультуры і спорту праводзіць раённыя спаборніцтвы сярод пярвічных арганізацый БПСМ на прызы РК БПСМ па футболу, валейболу і інш.

У сувязі з тым, што многія маладыя людзі не ведаюць сваіх правоў і прадстаўляемых дзяржавай магчымасцей па будаўніцтву і набыццю жылля, прадметаў бытавога абіходу, райкамам БПСМ падрыхтаваны інфармацыйны матэрыял для моладзі раёна аб умовах выдачы крэдытаў маладым сем’ям на будаўніцтва і пакупку жылля, набыццё сродкаў малой механізацыі, хатняй жывёлы, бытавых і гаспадарчых прадметаў абіходу і да т.п.

Пачынаючы з 6 верасня,  праводзіцца раённы конкурс шоу-праграм і дыскатэк, у якім будуць прымаць удзел большасць пярвічный арганізацый БПСМ.

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта РБ А.Р. Лукашэнкі аб арганізацыі адкрытых маладзёжных дыскатэк, прысвечаных Дню ведаў, у абласных і раённых цэнтрах райкам БПСМ сумесна з аддзелам па справах моладзі райвыканкама, аддзелам культуры райвыканкама падрыхтавалі падарунак моладзі райцэнтра і правялі 7 верасня адкрытую бясплатную дыскатэку на пляцоўцы каля раённага Дома культуры. Праводзіліся пазнавальныя гульні, конкурсы, інфармацыйныя, музычныя праграмы, працаваў буфет.

## Фестываль школьных пярвічак

Як паведамілі ў РК БПСМ, праводзіцца фестываль школьных пярвічных арганізацый БПСМ. Ён будзе праходзіць у 1998-99 навучальным годзе ў тры этапы.

Першы этап – раённы адборачны тур, дзе будуць вызначаны лепшыя пярвічныя арганізацыі раёна. Другі этап – занальныя конкурсы гэтых арганізацый. У нашу зону ўваходзяць: Шаркаўшчынскі, Міёрскі, Глыбоцкі, Пастаўскі, Докшыцкі, Браслаўскі раёны. Спаборніцтвы пярвічных арганізацый названых раёнаў будуць праходзіць 17 сакавіка на базе шаркаўшчынскага райкама БПСМ. Трэці этап – абласны конкурс, які вызначыць мацнейшых – 9 красавіка ў Віцебску.

Вельмі прыемна, што актывізавалася жыццё пярвічных арганізацый БПСМ. А такое выклікана жыццём, бо мы не раз і не два бачым, што наша моладзь займаецца далёка не тымі справамі, якія вельмі патрэбны для грамадства. І таму няхай гэтыя першыя крокі станаўлення БПСМ і ажыццяўленне намечанага гэтай арганізацыяй паспрыяюць духоўнаму станаўленню моладзі.

**Справаздачна-выбарная канферэнцыя**
*(інфармацыйнае паведамленне)*

25 лютага ў зале раённага Дома культуры адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя раённай арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларускі патрыятычны саюз моладзі”.

На парадак дня былі вынесены наступныя пытанні:

1. Справаздача раённага камітэта Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.
2. Выбары членаў райкама БПСМ.
3. Выбары кантрольнай камісіі раённай арганізацыі БПСМ.
4. Выбары дэлегатаў на III справаздачна-выбарную канферэнцыю абласной арганізацыі.

З дакладам па першаму пытанню выступіў першы сакратар райкама БПСМ Анатоль Лаўрыновіч.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел сакратар пярвічнай арганізацыі Германавіцкай сярэдняй школы Святлана Кавалёнак, сакратар пярвічнай арганізацыі “Алімп” Іна Машнюк, вучаніца Шаркаўшчынскай СШ№2 Марына Тарарака.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі выбраны новы райкам БПСМ з пятнаццаці чалавек. У яго ўвайшлі пасля адкрытага персанальнага галасавання Анна Аксентэ, Анна Алексіна, Сяргей Качан, Ірына Каралёва, Сяргей Кандраценка, Алена Катовіч, Мікалай Лабуць, Анатоль Лаўрыновіч, Казімір Ластаўка, Аляксандр Магаліцкі, Іна Машнюк, Святлана Мядзелец, Ірына Аляхновіч, Марына Тарарака, Наталля Філіпёнак.

Членамі кантрольнай камісіі выбраны Галіна Ліпская, Іна Машнюк, Аксана Кукуць. Старшынёй камісіі зацверджана Аксана Кукуць.

Дэлегатамі на III абласную справаздачна-выбарную канферэнцыю БПСМ выбраны Анатоль Лаўрыновіч, Аляксандр Магаліцкі, Ірына Каралёва, Ірына Аляхновіч, Сягрей Качан, Жанна Талапіла.

Адбыўся арганізацыйны пленум райкама БПСМ. На ім першым сакратаром райкама БПСМ выбраны Анатоль Лаўрыновіч.

## На шляху станаўлення

(*з даклада справаздачна-выбарнай канферэнцыі першага сакратарарайкама БПСМ Анатоля Лаўрыновіча*)

Паважаныя сябры!

Сёння мы ў чарговы раз падводзім вынікі сваёй работы, намячаем новыя крокі нашай практычнай дзейнасці. Адзначу, што наша арганізацыя з кожным днём набірае сілу, кожны новы дзень нараджае новыя ідэі, якія мы рэалізуем у сваёй паўсядзённай рабоце па выхаванню моладзі.

Маладзёжная арганізацыя застаецца вернай сваім прынцыпам і творчым задумам. Мы не бяром нейкіх непасільных задач, але крок за крокам прыцягваем моладзь у нашы рады, набываем вопыт зносін, культуру, уменне прыгожа адпачываць, адчуць сябе асобай, якая прынясе ў далейшым вялікую карысць для нашай Радзімы.

Сёння хачу перш за ўсё завастрыць увагу ўдзельнікаў канферэнцыі на некаторых фактах і лічбах, якія характарызуюць як колькасны, так і якасны стан нашай раённай арганізацыі.

На дадзены момант наша раённая арганізацыя налічвае ў сваіх радах 588 членаў БПСМ. З іх у сельскай мясцовасці – 109 чалавек, у арганізацыях і на прадпрыемствах – 24, школьнай моладзі – 395 чалавек. Колькасць членаў БПСМ у нашых радах няспынна вагаецца, але ўсе гэтыя змяненні звязаны ў першую чаргу з тым, што з нашых радоў выбываюць школьнікі. Але яны не страчваюцца, а становяцца на ўлік у сярэдніх спецыяльных ці вышэйшых навучальных установах. Значыць, раённы камітэт БПСМ змог зацікавіць, данесці да кожнага тыя ідэі, формы і метады работы, якія акрэслены ў нашым статуце, статуце Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.

Пераходзячы да непасрэднай ацэнкі сітуацыі па рабоце за справаздачны перыяд, хачу, каб кожны з вас глыбока прадумаў сказанае і вынес свае думкі для арганізацыі паўнацэннай работы ў будучым.

Плануючы работу нашай арганізацыі, мы ўлічвалі спецыфіку раёна. Вось тыя прыярытэтныя напрамкі, на якіх былі сканцэнтраваны асноўныя намаганні, – патрыятычны, спартыўна-турыстычны, культурна-забаўляльны. Пакуль што сканцэнтраваць асноўную ўвагу на чымсьці адным не можам, бо трэба распрацоўваць доўгатэрміновую праграму, закладваць пад яе неабходнае фінансаванне. Мы ж улічваем эканамічны стан як у краіне ў цэлым, так і ў раёне, дзе многія арганізацыі і гаспадаркі неплацёжаздольныя. І прыходзячы да кіраўнікоў, вельмі часта чуем ад іх, што на першым плане выплата заработнай платы, уборка вырашчанага ўраджаю, клопат аб ураджаі заўтрашнім. Праўда, не адмаўляюць, але ж раяць пачакаць, паспадзявацца на лепшыя змены ў недалёкім будучым. А мы ж чакаць не можам. Час ідзе, а маладосць назад не вернеш.

Тым не менш райкамам праводзілася і праводзіцца работа праз прапаганду здаровага актыўнага адпачынку пры дапамозе спартыўных і культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца сумесна з аддзелам па справах моладзі райвыканкама, фізічнай культуры, спорту і турызму, аддзеламі адукацыі і культуры райвыканкама.

За справаздачны перыяд былі праведзены наступныя мерапрыемствы, фінансаванне якіх ажыццяўлялася з рэспубліканскага бюджэту: раённыя спаборніцтвы сярод камбайнёраў і вадзіцеляў; раённы конкурс на лепшую пярвічную арганізацыю БПСМ; “Дзень ведаў”; акцыя міласэрнасці “Падзяліся цяплом душы сваёй”.

На правядзенне вышэй пералічаных мерапрыемстваў выдаткавана 11 мільёнаў рублёў. Вядома, сумма яўна недастатковая для шырокай арганізацыі работы сярод моладзі, тым больш, што ў папярэднія гады яны былі ў некалькі разоў большыя.

Бузумоўна, пры арганізацыі Беларускага патрыятычнага  саюза моладзі нам была аказана даволі вялікая дапамога. Выдзелены кабінеты, набыта неабходнае абсталяванне. Цяпер жа сітуацыя крыху змянілася. Даводзіцца самім шукаць зацікаўленых асоб, пры дапамозе якіх можна было б правесці тое або іншае мерапрыемства, штосьці купіць.

Хочацца выказаць асаблівыя словы ўдзячнасці загадчыку аддзела па справах моладзі райвыканкама Ігару Афанасьевічу Іванову, загадчыку аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Сяргею Леанідавічу Каплуноўскаму, дырэктару раённага Дома культуры Галіне Аляксееўне Русачонак, дырэктару цэнтра па выхаваўчай рабоце Валянціне Барысаўне Васілеўскай за дапамогу ў арганізацыі многіх мерапрыемстваў. Дзякуючы ім, і пры іх непасрэдным удзеле былі праведзены раённы злёт піянераў, раённы турыстычны злёт моладзі, раённы злёт моладзі, прысвечаны 55-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, раённае свята “Дзень прызыўніка”, навагодні ранішнік для дзяцей-сірот і інвалідаў, два этапы раённай гульні “Зарніца”, адзін этап конкурсу плаката і рэферата, прысвечаны 54-й гадавіне заканчэння другой сусветнай вайны, і некаторыя іншыя. Сумесна з аддзелам па справах моладзі райвыканкама распрацаваны рад дакументаў, якія дапамагаюць моладзі арганізоўваць і сістэматызаваць работу пярвічных арганізацый. Распрацаваны праект плана работы для пярвічных арганізацый гаспадарак і прадпрыемстваў. У яго ўключаны асноўныя накірункі і мерапрыемствы па рабоце з моладдзю, якая цесна ўплятаецца з адміністрацыямі прадпрыемстваў, кіраўніцтвам гаспадарак, прафсаюзнымі камітэтамі. Асноўным дакументам у вырашэнні маладзёжных пытанняў у раздзеле “Моладзь” з’яўляецца прыкладны пералік усемагчымых абавязацельстваў і марапрыемстваў калектыўнага дагавора. У ім ёсць пункты па арганізацыі, узаемадзеянню з кіраўніцтвамі гаспадарак і арганізацый, сацыяльнай абароне моладзі, падтрымцы ініцыятыў і пачынанняў, матэрыяльнай дапамозе і г.д. таму вельмі важна на справаздачных сходах, што праходзяць у пярвічных арганізацыях, завастрыць увагу на тых праблемах, якія ўзнікаюць перад моладдзю штодзённа. Лічу, што больш цесным павінна быць узаемадзеянне моладзі са сродкамі масавай інфармацыі. Як паказвае практыка, важна не только правесці нейкае мерапрыемства, а і ўмець расказаць аб ім, данесці да масавага чытача. Няхай людзі ведаюць, што мы, моладзь, не толькі штосьці плануем, а і займаем канкрэтную пазіцыю па выхаванню падрастаючага пакалення.Так, жыць цяпер складана, але цікава. Не чакайце лепшага часу, а так, як вы самі маладыя, імкніцеся самастойна вырашаць жыццёвыя праблемы. Гэта ў вашых сілах. Будзем аптымістамі. У нас усё атрымаецца на шляху станаўлення нашай маладзёжнай арганізацыі.

**БПСМ – вызначае арыенціры**

*(з успамінаў Анатоля Лаўрыновіча)*

У канцы красавіка прайшоў II з’езд Беларускага патрыятычнага саюза моладзі. Дэлегатамі на з’езд ад Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі БПСМ былі вылучаны першы сакратар райкама БПСМ Анатоль Лаўрыновіч, сакратар райкама БПСМ Аляксандр Магаліцкі, кіраўнік пярвічнай арганізацыі БПСМ калгаса “Маяк” Казімір Ластаўка.

На II з’ездзе Беларускага патрыятычнага саюза моладзі былі падведзены вынікі работы гэтага грамадскага аб’яднання за тры гады, якія мінулі пасля яго ўтварэння. Галоўная ж задача з’езда, які адбыўся ў Мінску – выпрацаваць арыенціры, асноўныя накірункі работы на будучае.

На рахунку БПСМ нямала добрых спраў: спартыўныя мерапрыемствы, турыстычныя паходы, узнаўленне будаатрадаўскага руху, разнастайныя конкурсы, фестывалі. Мы на першым часе стварэння раённай арганізацыі шмат увагі ўдзялялі росту радоў. Арганізоўваем маладзёжныя вечары, спаборніцтвы, конкурсы, аднавілі, у прыватнасці, ваенна-патрыятычную гульню “Зарніца”. Вялікую цікавасць заваявала ў нашай моладзі інтэлектуальная гульня брэйн-рынг, якую праводзіць райкам БПСМ. Цяпер рыхтуемся да раённага злёту моладзі. Цесна супрацоўнічаем з аддзелам па справах моладзі райвыканкама, цэнтрам пазашкольнай работы, з раённым Домам культуры.

II з’езд Беларускага патрыятычнага саюза моладзі прыняў праграму дзейнасці на 2000 – 2003 гады пад сімвалічнай назвай “Дадзім шанц маладым”. У адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі работы БПСМ яна складаецца з некалькіх спецыяльных праграм. Назаву некаторыя з іх. Праграма “Мы створаны для добрых спраў”, накіравана на выхаванне ў моладзі светапогляду, заснаванага на хрысціянскіх і патрыятычных маральна-духоўных каштоўнасцях і прадугледжвае добраахвотны ўдзел маладых людзей у розных гуманых акцыях, мерапрыемствах (клопат аб ветэранах, дзецях-сіротах, дапамога інвалідам, упарадкаванне гарадоў, вёсак, помнікаў і г.д.). Ёсць праграма “Будзь здаровы”. Яе мэта – стварыць сярод моладзі культ здароўя, здаровага ладу жыцця, прывіць захапленне фізкультурай, спортам, турызмам і негатыўнымі адносінамі да наркотыкаў, алкаголю, табакі. Мэта праграмы “Культ асобы” – пастаянна знаходзіць і падтрымліваць маладыя таленты, ствараць магчымасці для маладых праявіць сябе ў той, ці іншай сферы дзейнасці. Назвы праграм “Мы знойдзем Вам работу па душы”, “Людзі новага стагоддзя”, “Будуй, пакуль малады” гавораць самі за сябе. Яны накіраваны на выхаванне энергічных, талковых, ініцыятыўных маладых людзей. Кожная праграма прадугледжвае шэраг канкрэтных мерапрыемстваў: акцый, конкурсаў, фестываляў, спаборніцтваў. Урачыстая абстаноўка, у якой праходзіў з’езд, прысутнасць кіраўнікоў дзяржавы, нетрадыцыйная форма правядзення – усё гэта пакінула вельмі добрыя ўражанні. А ўрачыстае ўнясенне Сцяга Перамогі – гэтай гістарычнай рэліквіі! Шмат было цікавых выступленняў, канструктыўных прапаноў. Расшыралася наша кола знаёмстваў і не толькі з дэлегатамі з розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, але і Расіі, Балгарыі, Украіны, Літвы, Латвіі. Хачу падкрэсліць, што і прынятая на з’ездзе праграма “Дадзім шанц маладым” надае аптымізму, натхняе на працу.

## Усё для моладзі

*(з успамінаў першага сакратара райкама БПСМ А. Лаўрыновіча)*

Раённы камітэт БПСМ у сваёй рабоце прытрымліваецца перш за ўсё прынцыпу ажыццяўлення ідэй дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Галоўная задача для нас – рэалізацыя праектаў па сацыяльнай абароне маладога пакалення, падтрымка маладых талентаў, правядзенне розных акцый і мерапрыемстваў. За мінулы 2001 год раённым камітэтам БПСМ было арганізавана і праведзена больш 40 розных мерапрыемстваў і конкурсаў раённага ўзроўню.

Тут трэба адзначыць асноўныя накірункі, па якіх мы працуем. Напэўна не адкрыю таямніцы, калі скажу, што саюз у нас усё ж такі патрыятычны, таму асноўны накірунак – патрыятычнае выхаванне моладзі. Дзякуючы дапамозе І.А. Іванова, загадчыка аддзела па справах моладзі райвыканкама, С.Л. Каплуноўскага, загадчыка аддзела па фізкультуры, спорту і турызму райвыканкама, Ф.Г. Талан, загадчыцы аддзела культуры райвыканкама, А.А. Цітовіча, загадчыка раённага аддзела адукацыі, удалося падрыхтаваць і правесці наступныя мерапрыемствы: раённы фестываль аўтарскай песні 23 лютага ў РДК, пераможцы якога прымалі ўдзел у абласным фестывалі; 13-14 красавіка 2001 года адбылося раённае свята “Дзень прызыўніка”. У ім прынялі ўдзел амаль усе дапрызыўнікі і прызыўнікі раёна. Хлопцы, якія паказалі лепшыя вынікі, удзельнічалі ў абласных спаборніцтвах, дзе занялі 2-е агульнакаманднае месца; 25-27 мая праходзіў раённы турыстычны злёт моладзі, у якім прынялі ўдзел 26 каманд, якія спаборнічалі ў 25 розных конкурсах і спаборніцтвах; 6-7 чэрвеня праводзіўся раённы турзлёт школьнікаў; 21-23 чэрвеня каманда раёна прыняла ўдзел ў абласным злёце моладзі; 7-8 верасня Шаркаўшчына прымала ўдзельнікаў чацвёртага фестывалю сяброўства армейскай моладзі паветрана-дэсантных войск Расіі і Беларусі; у верасні праводзіўся раённы конкурс плакатаў, прысвечаны 57-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Наступны напрамак, па якому працуе райкам БПСМ – прпаганда здаровага ладу жыцця сярод моладзі. Праводзяцца наступныя спаборніцтвы: першынства раёна па валейболу, тэнісу, футболу, баскетболу, лёгкай атлетыцы.

З мэтай прафілактыкі курэння, п’янства, наркаманіі і СНІДу праводзіліся акцыі “Моладзь без наркотыкаў” і “Бросай курить”. А менавіта была праведзена тэматычная дыскатэка, арганізаваны і праведзены раённы конкурс плакатаў “Свет без наркотыкаў” сярод вучняў 9-11 класаў школ раёна, пераможцы якога прынялі ўдзел у абласным конкурсе.

З мэтай павышэння працоўнай актыўнасці моладзі ў многіх арганізацыях, установах, прадпрыемствах, саўгасах і калгасах арганізаваны конкурсы прафесійнага майстэрства. У 2001 годзе (ужо трэці год запар) праводзіўся раённы конкурс сярод маладых камбайнераў і вадзіцеляў, занятых на адвозцы зерня па выніках уборкі. Пераможцы конкурсу ўзнагароджаны прызамі і дыпломамі райкама БПСМ і аддзела па справах моладзі райвыканкама.

У раёне створаны і працуюць 180 клубаў па інтарэсах, розных секцый, гурткоў самадзейнай творчасці, якія наведваюць многія маладыя людзі. Развіваецца сетка клубаў па месцы жыхарства. З мэтай актывізацыі дзейнасці ў гэтым напрамку, аддзелам па справах моладзі райвыканкама, райкамам БПСМ і аддзелам па фізкультуры, спорту і турызму праведзены конкурс-агляд на лепшы маладзёжны гурток па месцы жыхарства. Вынікі яго будуць хутка падведзены.

У характары кожнага маладога чалавека ёсць прага да падарожжаў. Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр “Юнацтва” распрацоўвае і ажыццяўляе спецыяльную праграму развіцця маладзёжнага турызму.

Супрацоўнічаем мы таксама з рэдакцыяй газеты “Кліч Радзімы” , раённым радыё. Падцверджаннем гэтаму з’яўляецца правядзенне раённага конкурсу “Дэбют” 2001 года, у якім прынялі ўдзел больш 30 чалавек. Райкамам БПСМ быў уручаны прыз на патрыятычную тэматыку.

Як паказвае вопыт, маладыя людзі не заўсёды ведаюць як сябе праявіць, як паказаць сябе. Таму вельмі карысна прачытаць пра равеснікаў, пра іх інтарэсы, актыўнае, насычанае жыццё маладых людзей з нашага раёна. Апошнім часам у раённай газеце з’явілася нямала публікацый аб моладзі, што дапамагае нам у рабоце.

Райкам БПСМ займаецца прафарыентацыяй школьнікаў. У райкаме, у большасці пярвічных арганізацый БПСМ створаны прафарыентацыйныя стэнды. Праводзіцца прафтэсціраванне на камп’ютары. Сумесна з раённым цэнтрам занятасці насельніцтва арганізуем на выкананне работ па добраўпарадкаванню населеных пунктаў, пляжа, паркаў вучняў школ, цяжкіх падлеткаў.

Райвыканкамам прынята рашэнне аб будаўніцтве адкрытай танпляцоўкі каля РДК. Гэта даўняя мара моладзі, і думаецца, што яна збудзецца. Безумоўна, пры непасрэдным актыўным удзеле маладых людзей.

**БПСМ напярэдадні рэформ**

*(з успамінаў выконваючай абавязкі першага сакратара БПСМ Ірыны Каралёвай)*

24 ліпеня ў малой зале райвыканкама адбыўся пленум райкама грамадскага аб’яднання БПСМ. Разглядаліся наступныя пытанні: справаздача аб рабоце раённага камітэта грамадскага аб’яднання БПСМ за першае паўгоддзе 2002 года, абралі дэлегатаў на абласную канферэнцыю і на III з’езд грамадскага аб’яднання БПСМ, прынялі зварот ад моладзі раёна.

Райкам БПСМ у сваёй рабоце прытрымліваецца ідэй і прынцыпаў Дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. БПСМ рашае задачы па сацыяльнай абароне моладзі, праводзіць розныя мерапрыемствы, акцыі. У бягучым годзе былі арганізаваны і праведзены сумесна з рознымі аддзеламі райвыканкама 20 мерапрыемстваў раённага ўзроўню. Колькасць членаў арганізацыі павялічылася на 174 чалавекі. На сённяшні дзень у раёне 760 членаў БПСМ (302 школьнікі, 104 – вясковая моладзь, 354 – працоўная моладзь). Павелічэнне колькасці членаў БПСМ – гэта яскравы паказчык работы райкама, які змог зацікавіць маладых людзей, прапанаваць ім штосьці новенькае.

Аднак, што могуць паказаць сухія лічбы без аб’ектыўнага аналізу работы пярвічак і райкама. Большасць мерапрыемстваў у раёне праводзіцца непасрэдна ў райцэнтры. БПСМ працуе па некалькіх накірунках. Асноўны – патрыятычнае выхаванне моладзі, бо нездарма ў назве арганізацыі прысутнічае гэта слова. Трэба, каб моладзь ведала, цаніла і вывучала гістарычныя і культурныя каштоўнасці роднага краю. Райкам праводзіць прапаганду здаровага ладу жыцця: актыўны адпачынак, спартыўныя і культурна-масавыя мерапрыемствы. Большасць з іх арганізоўваюцца сумесна з аддзелам фізкультуры, спорту і турызму райвыканкама, аддзелам адукацыі райвыканкама, аддзелам культуры райвыканкама. Праводзіліся інтэлектуальныя гульні “Брэйн-рынг”, многім запомнілася свята “Салдат – заўжды салдат” 23 лютага, свята “Дзень прызыўніка”, святкаванне Дня Перамогі, раённы злёт піянераў, раённы злёт моладзі, абласны злёт моладзі.

Шмат увагі надае райкам БПСМ спорту. Сумесна з аддзелам фізкультуры, спорту і турызму праводзіліся наступныя спаборніцтвы: кубак раёна па валейболу, першынство раёна па настольнаму тэнісу, раённыя спаборніцтвы па шматбор’ю сярод вучняў школ раёна, першынство раёна па гіраваму спорту, кубак раёна па шашках, раённыя спаборніцтвы па чатырохбор’ю і “Алімпійскія старты” сярод вучняў школ раёна.

Важны накірунак у рабоце райкама БПСМ – прафарыентацыя моладзі. У школах афармляюцца стэнды, арганізоўваецца тэматычная тэлефоная лінія, праводзіцца камп’ютарнае тэсціраванне.

Трэба адзначыць лепшыя пярвічкі БПСМ: пярвічная арганізацыя райвыканкама, Германавіцкай СШ, Лужкаўскай СШ, Іёдскай СШ, Шаркаўшчынскай СШ № 1, калгаса імя Гагарына.

А зараз аб далейшым лёсе нашай арганізацыі. 30 красавіка 2002 года адбылася сустрэча Прэзідэнта РБ А. Лукашэнкі з актывам БПСМ. Абмяркоўваліся шляхі развіцця маладзёжнага руху на Беларусі. Як вядома, у нашай краіне дзейнічаюць дзве найбольш моцныя маладзёжныя арганізацыі: грамадскае аб'яднанне БПСМ і грамадскае аб' яднанне БСМ. Гэтыя дзве арганізацыі вырашаюць аднолькавыя пытанні, працуюць у адным накірунку. Зыходзячы з гэтага, прынята рашэнне аб іх аб'яднанні. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў гэтую ідэю падкрэсліўшы, што новая арганізацыя павінна быць дэмакратычнай, а аб'яднанне праходзіць на парытэтнай аснове пры захаванні лепшых традыцый абедзвюх арганізацый.

У маі 2002 года БПСМ і БСМ правялі пашыраныя пленумы Цэнтральных камітэтаў, дзе разглядалася пытанне аб будучым аб'яднанні.

Дарэчы, зараз праходзіць конкурс на лепшую назву і сімволіку аб'яднанай арганізацыі. У ім могуць паўдзельнічаць і прадстаўнікі нашага раёна. Пераможцу чакае каштоўны прыз.

Таксама на пленуме былі ўзнагароджаны лепшыя пярвічныя арганізацыі і лепшыя сакратары пярвічак. За актыўны ўдзел у рабоце райкама грамадскага аб'яднання БПСМ Ганаровай граматай узнагароджаны пярвічныя арганізацыі Шаркаўшчынскай СШ № 1, Германавіцкай СШ, калгаса імя Гагарына. Таксама атрымалі Ганаровыя граматы найбольш актыўныя члены БПСМ: сакратар пярвічкі калгаса імя Гагарына Жанна Рымдёнак і сакратар пярвічкі раённага вузла паштовай сувязі Мікалай Лабуць.

## 25 канферэнцыя райкама БРСМ

8 кастрычніка ў вялікай зале Дома Саветаў адбылася 25-я канферэнцыя грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”. (Нагадаем, што БРСМ з’яўляецца пераемнікам Ленінскага камсамола, а ў 1989 годзе ў нашым раёне прайшла апошняя, 24-я канферэнцыя тагачаснага камсамола).

На парадак дня канферэнцыі былі вынесены наступныя пытанні:

1. Аб стварэнні грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”.

2. Аб выбранні раённага камітэта грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”.

3. Аб выбранні раённай кантрольнай камісіі грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”.

4. Аб выбранні дэлегатаў на абласную канферэнцыю грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”.

Са справаздачай аб рабоце райкама БПСМ выступіла выконваючая абавязкі першага сакратара райкама БПСМ Ірына Каралёва.

На канферэнцыі выступілі вучаніца Германавіцкай СШ Таццяна Лагунёнак, аператар раённага вузла электрасувязі Марына Сіповіч, вучань Шаркаўшчынскай СШ № 1 Павел Фядотаў, казначэй раёна Сяргей Качан, педагог-арганізатар Шаркаўшчынскай СШ №1 Таццяна Целюкоўская.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел галоўны спецыяліст арганізацыйна-кадравай работы Віцебскага аблвыканкама Б.Ф. Сівіцкі, першы намеснік старшыні райвыканкама Г.М. Дубоўскі, які выступіў з прамовай, намеснік старшыні райвыканкама Г.Ф. Волах, рэдактар раённай газеты “Кліч Радзімы” Э.А. Корсак.

Пасля канферэнцыі адбыўся арганізацыйны пленум. Першым сакратаром райкама БРСМ выбраны Сяргей Седзюкевіч. Другім сакратаром – Ірына Каралёва.

**БРСМаўцы пра камсамол**

У Шаркаўшчынскай СШ №1 завяршыўся творчы конкурс, прысвечаны 85-годдзю камсамола. Удзел прымалі ўсе жадаючыя, у асноўным, члены грамадскага аб'яднання БРСМ. Журы вызначыла лепшыя вершаваныя творы, аўтарамі якіх з'яўляюцца Наташа Бука, Насця Усцінава, Даша Даргель, Таня Новікава і Маша Ермаловіч. Дзяўчатам прыйшлося пастарацца, каб атрымаўся верш пра самы масавы маладзёжны рух былога Савецкага Саюза, пра які яны ведаюць толькі па расказах старэйшых. Даша Даргель зазначыла: "Тэма, зразумела, складаная, але мы шмат чыталі пра гэты маладзёжны рух, маем сваё бачанне яго мэт і задач". Па словах Насці Усцінавай, члены БРСМ павінны ведаць пра сваіх папярэднікаў для таго, каб узяць ад іх самае лепшае. Наташа Бука вельмі любіць пісаць вершы, таму з ахвотаю пагадзілася на ўдзел у конкурсе. У ходзе падрыхтоўкі да конкурсу школьніцы адкрылі для сябе шмат новага і цікавага, што пашырыла іх кругагляд.



**Камсамолу – 90!**

23 кастрычніка ў РДК прайшла ўрачыстасць, прымеркаваная да 90-годдзя камсамола.

Намеснік старшыні райвыканкама І.А. Лаўрыновіч павіншаваў ветэранаў камсамола са святам.

Былы старшыня былога калгаса імя Гагарына Н.Я. Протас падзяліўся сваімі ўспамінамі пра камсамольскую маладосць.

З найлепшымі пажаданнямі выступіў старшыня раённай ветэранскай арганізацыі У.П. Слабовіч.

Пра лепшыя гады – сваё камсамольскае юнацтва, – расказала загадчыца сельгасаддзела раённай газеты "Кліч Радзімы" К.М. Сосна.

Вучням школ раёна ўрачыста ўручылі членскія білеты БРСМ Эдуард Аляксандравіч Корсак, Ядзвіга Баляславаўна Чарвінская, Іван Антонавіч Лаўрыновіч і Марына Фёдарава.





# БРСМ – правапераемнік камсамола

18 красавіка ў РДК адбылася 27 справаздачна-выбарная канферэнцыя Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі БРСМ. На парадку дня маладзёжнага форуму стаялі надзённыя пытанні.

Мэта канферэнцыі – падвядзенне вынікаў работы. Па першаму пытанню са справаздачай раённай арганізацыі за 2005 – 2008 гады выступілі выконваючыя абавязкі першага сакратара райкама БРСМ Марына Фёдарава, якая акцэнтавала ўвагу прысутных на дасягненнях і праліках раённай арганізацыі.



Прадстаўніца Шаракаўшчынскай СШ №1 Юля Сіняўская зрабіла даклад мандатнай камісіі.

Супрацоўнік інспекцыі па падатках і зборах Андрэй Навічонак, які прадстаўляў кантрольную камісію, інфармаваў пра выкарыстанне грашовых сродкаў райкамам.

Ульяна Мілянцей з Іёдскай СШ і Аліса Станкова з Шаркаўшчынскай СШ № 2 падзяліліся інфармацыяй пра дзейнасць школьных пярвічак.

Намеснік дырэктара прадстаўніцтва Белдзяржстраху па Шаркаўшчынскаму раёну Святлана Буткевіч выступіла ад імя працуючай моладзі. Старшыня раённай піянерскай арганізацыі Наталля Шакялеўская акцэнтавала ўвагу на супрацоўніцтве піянераў з членамі БРСМ.

Інструктар па спорту з сельгаспрадпрыемства “Гарадзец” Яўген Чысцякоў расказаў пра тое, як адпачывае сельская моладзь.

Педагог-арганізатар Шаркаўшчынскай СШ №1 Аксана Пачопка пазнаёміла прысутных з метадамі арганізацыі пазашкольнай работы і адпачынку дзяцей.

Пасля гэтага Марына Фёдарава зачытала ліст, які даслала былы лідар шаркаўшчынскай моладзі, а зараз другі сакратар аднаго з мінскіх райкамаў БРСМ Марына Таўкінь.

Успамінамі пра камсамольскую маладосць падзялілася Ядзвіга Баляславаўна Чарвінская, якая зараз з' яўляецца старшынёй раённай арганізацыі ветэранаў камсамола.

Пра тое, як працавала і адпачывала моладзь 50-70 гадоў расказаў ветэран працы Нікадзім Якаўлевіч Протас.

Даў ацэнку работы райкама, падкрэсліўшы, як моцныя бакі, так і слабыя, галоўны спецыяліст абласнога камітэта БРСМ Аляксандр Аляксеевіч Цароў.

Старшыня райвыканкама Мечыслаў Віктаравіч Морхат зрабіў акцэнт на сувязі пакаленняў, а таксама акрэсліў перспектывы.

Адказная справа – абранне райкама. У яго склад увайшлі: галоўны спецыяліст ідэалагічнага аддзела райвыканкама М.К. Буткевіч, настаўніца СШ №1 М.К. Грыгаровіч, вучаніца СШ №2 Н.П. Каланда, намеснік начальніка РАНС В.М. Ліпскі, намеснік старшыні СВК "Буеўшчына" Д.М. Ламака, старшы інспектар-інжынер аддзялення Дэпартамента аховы Я.М. Луцэнка, эксперт-крыміналіст РАУС Р.В. Алянцэвіч, загадчыца метадычнага кабінета РАА І.Р. Рымдзёнак, другі сакратар райкама БРСМ В.А. Сташэўская, загадчык майстэрняў ПМС С.К. Талапіла, першы сакратар райкама БРСМ М.П. Фёдарава, вучаніца СШ №1 Т.В. Хахель, старшыня райсавета ветэранаў камсамола Я.Б. Чарвінская, інспектар па кадрах СВК "Княж" Т.С. Шышко, галоўны спецыяліст райкама БРСМ І.П. Янучкоўская.

Трэццяе пытанне – абранне кантрольнай камісіі. У яе склад увайшлі: С.К. Буткевіч, бухгалтар РАА А.В. Заяц і сакратар-машыністка ККП Т.Л. Монская.

Прадстаўляць раён на абласной канферэнцыі будуць М.К. Буткевіч, Д.М. Ламака, В.А. Сташэўская, С.К. Талапіла, М.П. Фёдарава, Т.С. Шышко.

На заканчэнне канферэнцыі быў зачытаны зварот да моладзі раёна.

На арганізацыйным пленуме абралі першага сакратара райкама – Марыну Фёдараву і другога – Вольгу Сташэўскую, а таксама склад бюро.

Старшыня райвыканкама М.В. Морхат уручыў падзячныя лісты і грашовыя прэміі найбольш актыўным членам маладзёжнай арганізацыі Дзмітрыю Аніськовічу (СШ №2), Юлі Сіняўскай (СШ №1), Ульяне Мілянцей (Іёдская СШ), Алене Курыловіч (РТМА), Таццяне Шышко (СВК "Княж").

Сапраўдны сюрпрыз удзельнікам канферэнцыі падрыхтавалі культработнікі – іх чакала цікавая канцэртная праграма. Сярод найбольш запамінальных нумароў – выступленне вакальна-інструментальных ансамбляў СШ № 1 і Лужкаўскай СШ.

**“Школьны марафон”: занальны этап у Шаркаўшчыне**

У снежні ў Шаркаўшчыне праходзіў занальны этап абласнога конкурсу на лепшую пярвічную арганізацыю БРСМ “Школьны марафон”. У ім удзельнічалі, акрамя гаспадароў, каманды з суседніх раёнаў – Міёрскага, Браслаўскага, Глыбоцкага і Пастаўскага. Усяго – сем дружын. Трэба адзначыць, што конкурсная праграма юыла складанай, але каманды спраўляліся з заданнямі выдатна, бо ў сваіх раённах яны прадэманстравалі нядрэнныя вынікі – занялі прызавыя месцы.

Шаркаўшчынскую моладзь прадстаўлялі вучні сярэдніх школ: №1 райцэнтра і Германавіцкай.

У праграме былі наступныя конкурсы: творчыя справаздачы “Малады веснік”, электронныя прэзентацыі “Мы – нашчадкі камсамола!”, візітныя карткі “Камсамол XXI стагоддзя”, маладзёжныя сацыяльныя ініцыятывы “Разам у будучыню!”, конкурс капітанаў.

Каманда Шаркаўшчынскай СШ №1 пад назвай “Мы” падрыхтавала цудоўную візітку ўласнай школьнай пярвічкі. Арыгінальныя касцюмы, яркае і эмацыянальнае выступленне пра тое, як праводзіць вольны час наша моладзь, спадабалася прысутным.

У ходзе конкурснай праграмы каманда нашага райцэнтра заспявала песню “Мы за Беларусь”, аўтарамі якой з’яўляюцца самі школьнікі.

Добра выступілі германавіцкія хлопцы і дзяўчаты. Іх праект “За моцную і квітнеючую Беларусь!” прызнаны адным з лепшых.

І вось амаль чатырохгадзінны конкурсны марафон закончыўся. Удзельнікі стомленныя, але задаволеныя чакаюць падвядзення вынікаў. Склад журы наступны: спецыяліст абласнога ўпраўлення цэнтра пазашкольнай работы І.Ф. Дзмітрыўеская, галоўны спецыяліст аддзела рэалізацыі маладзёжных праграм абласнога камітэта БРСМ А.А. Цароў, старшыння раённай арганізацыі ветэранаў камсамола Я.Б. Чарвінская і метадыст раённай бібліятэкі Ю.Л. Протас.



І вось вынікі. Першае месца прысуджана камандзе з Глыбокага. Другое – у Шаркаўшчынскай СШ №1. Трэція – браслаўчане. Чацвёртымі сталі прадстаўнікі Германавіцкай СШ. Трэба адзначыць, што наўы землякі выступілі цудоўна. Вучні з райцэнтра зусім нямнога не дацягнулі да перамогі.

Падчас мерапрыемства былі ўзнагароджаны пераможцы раённага конкурсу плакатаў “Праблемы СНІДу вачамі моладзі”. Першы сакратар райкама БРСМ Марына Фёдарава ўручыла ім прызы.

Увогуле, занальны этап “школьнага марафону” прайшоў на высокім узроўні. У гэтым вялікая заслуга арганізатараў – работнікаў райкама БРСМ.

У сваю чаргу другі сакратар райкама БРСМ Вольга Сташэўская выказвае словы падзякі педагогу-арганізатару СШ №1 Аксане Паўлаўне Пачапко і намесніку дырэктара па выхаваўчай рабоце Германавіцкай СШ Іне Сямёнаўне Пучынскай.

## Лагер “Зорны” збірае сяброў

Гэтым летам лагер “Зорны” ў чарговы раз сабраў актывістаў БРСМ у аграгарадку Лужкі. У кругласутачным валанцёрскім лагеры былі прадстаўнікі Шаркаўшчынскіх СШ №1 і № 2, Германавіцкай, Слабадской, Іёдскай сярэдніх і Гуркаўскай базавай школ. Лагер Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ўжо не першы раз збірае моладзь раёна. Для многіх хлопцаў і дзяўчат гэта цудоўная магчымасць адпачываць, пазнаёміцца са сваімі равеснікамі з іншых школ.

Лідары БРСМ, якія з’яўляюцца аўтарамі ідэі стварэння падобнага месца адпачынку, прыкладаюць намаганні, каб увасобіць усе задумы ў жыццё. Адно мерапрыемства змяняецца другім. Невялічкі адпачынак і зноў за справу – валанцёрам нельга сядзець склаўшы рукі. Насычаная і прадуманая праграма – вось сакрэт поспеху “Зорнага”, які на працягу апошніх гадоў набыў вялікую папулярнасць сярод школьнікаў.

Не забываюць валанцёры пра працу. За дзевяць дзён знаходжання ў Лужках добраўпарадкаваны мясцовы парк. Дзеці таксама прыбіралі смецце на вуліцах аграгарадка, працавалі ў фізкультурна-спартыўным цэнтры.

Лета 2009 года запомніцца валанцёрам надоўга. Сумаваць у “Зорным” не было часу. Тым больш, што па суседству размяшчаўся кругласутачны лагер Лужкаўскай СШ. Дзеці паспелі пасябраваць за час знаходжання ў маляўнічым кутку аграгарадка.



У дзень моладзі паміж удзельнікамі двух лагераў праводзілася спартакіяда. У яе межах прайшлі спаборніцтвы па дартсу, валейболу, бегавыя эстафеты. Надоўга хлопцам і дзяўчатам запомніцца конкурс “Міс і Містэр лагера”, пасвячэнне ў валанцёры, экскурсія ў вёску Мосар.

На заканчэнні змены мы, арганізатары, вырашылі даведацца, чым запомніўся дзецям гэты час, праведзены ў Лужках. Школьнікі адзначылі, што кожны дзень быў запамінальны, бо непадобны на іншыя. Усім спадабаліся вясёлыя конкурсы, размовы ля кастра, насычанае жыццё палатачнага лагера. Але асноўнае тое, што ўсе без выключэння знайшлі новых сяброў.

“Зорны” ў чарговы раз дазволіў пераканацца, што ў БРСМ прыходзіць актыўная, вясёлая і творчая моладзь. А гэта азначае, што наперадзе ў арганізацыі цікавыя ідэі і праекты.

**Вольга Сташэўская**
**другі сакратар райкама БРСМ**



## Адобрана праграма дзеянняў

30 студзеня адбыўся чарговы пленум раённага камітэта БРСМ. У нарадзе прынялі ўдзел лідгры працоўнай і школьнай моладзі.

На пачатку выступіў начальнік аддзела па справах моладзі райвыканкама І.А. Іваноў. Ігар Афанасьевіч падвёў вынікі за год па рэалізацыі Дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Шаркаўшчынскім раёне. Дарэчы, наш рэгіён адносіцца да ліку лепшых у вобласці па працы з моладдзю. Было адзначана, што поспехаў шаркаўчане дасягнулі дзякуючы граматнай сістэме работы, якая трымаецца на “трох кітах”. Першы сакрэт поспеху – усе праблемы вырашаюцца сумеснымі намаганнямі. Арганізацыі райцэнтра і сельскіх населеных пунктаў працуюць у адной звязцы.

Другі – мэтанакіраваная кадравая палітыка. Вынікі работы з моладдзю залежыць ад спецыялістаў на месцах. Ігар Афанасьевіч назваў такіх лідараў, як Сяргей Буйка з ДБУ-26, Барыс Хадкевіч з ПМК-68, Людміла Рагачэўская з СВК “Наваселле”.

Трэцці складальнік поспеху – адпрацаваная сістэма, якую падтрымлівае кіраўніцтва раёна. Конкурсы, якія рэгулярна праводзяцца, дзеляць удзельнікаў на чатыры групы: сельгаспрадпрыемствы, прадпрыемствы райцэнтра, педкалектывы і вучнёўская моладзь.

Традыцыйнымі ў Шаркаўшчыне сталі спаборніцтвы тыпу “Лепшы па прафесіі”. Конкурсы профмайстэрства збіраюць удзельнікаў з розных арганізацый.

З кожным годам набірае тэмпы спартыўна-масавая работа. Сёння ў райцэнтры дзейнічаюць некалькі фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў – у ДБУ-26, ПМК-68, ДРБУ-131, ПМС. Падобныя комплексы ўводзяцца ў строй у аграгарадках і вёсках. З 11 сельгаспрадпрыемстваў 8 маюць уласныя ФАЦ. Цудоўныя ўмовы для адпачынку створаны ў Лужках, Германавічах, Радзюках, Васюках.

Наступны факт сведчыць пра тое, што кіраўніцтва раёна падтрымлівае рэалізацыю маладзёжных праграм: у 2008 годзе было выдзелена 23 мільёны рублёў на падобныя ініцыятывы, з іх 10 мільёнаўпайшлі на расходы, звязанныя з узнагароджваннем пераможцаў спаборніцтваў.

Галоўнай праблемай застаецца недахоп граматных і ініцыятыўных кадраў у вёсках.

Згодна з парадккам дня пленума РК БРСМ падводзіліся вынікі працы раённай арганізацыі за 2008 год. Са справаздачай выступіла першы сакратар М. Фёдарава.

На сённяшні дзень раённая арганізацыя налічвае ў сваіх радах 1.016 членаў. У мінулым годзе прайшло шмат мерапрыемстваў патрыятычнага, спартыўнага і культурна-забаўляльнага напрамкаў. Райкам займаўся прафарыентацыйнай работай, прапагандай здаровага ладу жыцця, садзейнічаў працоўнай занятасці школьнікаў і студэнтаў, аказваў шэфскую дапамогу сельгаспрадпрыемствам. Удзельнікамі пленума прынята адпаведная пастанова па выніках работы за 2008 год і планах на бягучы.

Прысутныя ўдзялілі належную ўвагу і падрыхтоўцы да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Планамі падзялілася другі сакратар БРСМ Вольга Сташэўская.

Старшыня райсавета ветэранаў У.П. Слабовіч адобрыў ініцыятыву маладых. Уладзімір Пятровіч адзначыў, што ветэраны вайны і працы заўсёды дапамогуць. Ад падобнага супрацоўніцтва выйграюць абодва бакі.

З прапановай да моладзі звярнулася старшыня раённай арганізацыі ветэранаў камсамола Я.Б. Чарвінская.

Такім чынам, на пленуме падсумавалі зробленае, азнаёмілі прысутных з планамі. Наступная падобная сустрэча лідараў БРСМ адбудзецца праз паўгода.

## На лепшую пярвічку

13 снежня ў цэнтры пазашкольнай работы праводзіўся раённы конкурс на лепшую пярвічную арганізацыю школьнай моладзі “Школьны марафон – 2008”. Ініцыятарам падзеі выступіў раённы камітэт БРСМ. Мэта падобных конкурсаў – актывізацыя дзейнасці пярвічак і выяўленне ініцыятыўнай, таленавітай моладзі.

Сёлета за ганаровае званне лепшай пярвічкі змагаліся чатыры каманды: Германавіцкая, Лужкаўская, Зоркаўская і Шаркаўшчынская № 1 сярэднія школы.

Распачалася праграма суботняга дня конкурсам творчых справаздач “Маладзёжны веснік”. Ён праходзіў у выглядзе аповеду пра жыццё пярвічкі. Каманды дэманстравалі фотаматэрыялы, публікацыі ў СМІ, сцэнарыі, метадычныя распрацоўкі і іншую інфармацыю, каб журы і школьнікі далі ацэнку зробленаму за год.

Электронная прэзентацыя “Мы – нашчадкі камсамола!” – другі этап. У ходзе яе гледачам дэманстраваўся фільм пра святкаванне ў школе 90-гадовага юбілею буйнейшай маладзёжнай арганізацыі СССР.

Візітная картка пярвічкі “Камсамол ХХІ стагоддзя” – трэцці іспыт. Каманды прадстаўлялі выступленне на тэму пераемнасці камсамольскіх традыцый і сувязі пакаленняў. Тут адкрыліся сапраўдныя артыстычныя таленты.

Конкурс маладзёжных сацыяльных ініцыятыў “Разам у будучыню!” – дэманстрацыя самых важных праектаў у гэтай сферы. Адлюстроўвалася валанцёрская і дабрачынная дзейнасць, шэфская дапамога, праца з піянерамі. Прысутным спадабаўся мультымедыйны праект германавіцкіх школьнікаў “За моцную і квітнеючую Беларусь” і прадстаўнікоў райцэнтра – вучняў СШ №1 – пад назвай “Дарогай дабра”.

Завяршылася выпрабаванне конкурсам капітанаў. Яно праводзілася экспромтам (папярэднія конкурсы – дамашнія загатоўкі). Ад капітанаў патрабавалася ахарактарызаваць  без слоў членаў сваёй каманды. Лідары прадэманстравалі, што ўмеюць знайсці выйсце з любой сітуацыі.

Конкурсная праграма завяршылася. Журы прызнала лепшым выступленне вучняў Шаркаўшчынскай СШ №1. Другое месца ў каманды з Германавіч, трэцімі сталі зоркаўскія хлопцы і дзяўчаты. Каманды аддзначаны салодкімі прызамі – капітанам уручылі тарты.

Прадстаўляць раён на занальным этапе будуць хлопцы і дзяўчаты з Шаркаўшчынскай і Германавіцкай сярэдніх школ.



**Наперадзе – усё жыццё**

Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь стаў асабліва значным і запамінальным для 5 навучэнцаў школ нашага раёна. 15 сакавіка кожны з іх упершыню атрымаў галоўны дакумент у жыцці кожнага чалавека – пашпарт грамадзяніна нашай краіны. Менавіта ў гэта дзень раённы камітэт БРСМ праводзіў акцыю “Мы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь”

Урачыстае мерапрыемства адбылося ў дзіцячай школе мастацтваў. Галоўнымі ўдзельнікамі сталі Таццяна Шкель (Шаркаўшчынская СШ №1), Вераніка Шыпіла, Анна Маліноўская (Лужкаўская СШ), Арцём Кавалёнак (Більдзюжская СШ) і Іна Феафанава (Шаркаўшчынская СШ №2). Кожны з гэтых маладых людзей атрымаў галоўны дакумент, з якога і пачнецца дарога ў дарослае жыццё. Адначасова з пашпартам прадстаўнікам падрастаючага пакалення былі ўручаны кнігі “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь” і вымпелы з выявай Шаркаўшчыны.



Шчырыя словы віншаванняў прагучалі ад гасцей свята: намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх райвыканкама В.І. Лемяшэўскай, старшыні раённага Савета ветэранаў У.П. Слабовіча, старшага ўчастковага інспектара РАУС А.І. Талапілы, першага сакратара райкама БРСМ М.П. Фёдаравай. З музычным падарункам выступілі выкладчыкі школы мастацтваў Ала Міхайлава і Анжэла Касцюкевіч.

Усе яны пажадалі прадстаўнікам падрастаючага пакалення смела глядзець у будучыню, не спыняцца перад цяжкасцямі і ганарыцца тым, што кожны з іх – грамадзянін Рэспублікі Беларусь.

**“Лідар – новае пакаленне”**

Героямі матэрыялу сталі актыўныя, творчыя і ініцыятыўныя людзі – лідары Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Яны – навучэнцы школ раёна. За плячамі ў іх – зусім невялікі жыццёвы вопыт, а наперадзе – цэлае жыццё.

Усе яны смела глядзяць у будучыню, не адступаюць перад цяжкасцямі. А калі бяруцца за якую-небудзь справу, то абавязкова давядуць яе да канца. Ды яшчэ знойдуць сабе аднадумцаў. Інакш і быць не можа.

А ўсё ж якім павінен быць сапраўдны лідар? З лёгкасцю адказаць на гэта пытанне могуць удзельнікі раённага конкурсу “Лідар – новае пакаленне”, які адбыўся 12 лютага ў нашым гарадскім пасёлку. Арганізатарамі яго выступілі раённы камітэт БРСМ і цэнтр пазашкольнай работы. Менавіта для іх, актыўных, творчых і мэтанакіраваных маладых людзей, былі падрыхтаваны цікавыя і, вядома ж, зусім няпростыя выпрабаванні.

Самым яркім і запамінальным для ўсіх удзельнікаў і гледачоў стаў конкурс “Візітка лідара”. Кожная каманда знаёміла прысутных з лідарам сваёй школьнай пярвічнай арганізацыі, дэманстравала яго таленты і здольнасці. Патрыятычнае выхаванне – важны накірунак дзейнасці маладзёжнага саюза. Таму і невыпадкова, што ўдзельнікам конкурснай праграмы прапанавалі прадставіць праекты “Мы – нашчадкі Перамогі”. Школьнікі разважалі на тэму “Будучыню Радзімы ствараць маладым”, адказвалі на пытанні віктарыны па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Цікавай і разнастайнай была конкурсная праграма і ўдзельнікі добра да яе падрыхтаваліся. А значыць, нялёгкая задача паўстала перад членамі журы – выбраць пераможцу. У склад судзейскай брыгады ўвайшлі загадчыца вучэбна-метадычнага кабінета РАА Ірына Рычардаўна Рымдзёнак, метадысты аддзела адукацыі Наталля Мікалаеўна Пастушкова і Наталля Пятроўна Турчынская. Прызавыя месцы размеркаваліся наступным чынам: III месца – Ілона Недзведзь (Іёдская СШ), II месца – Юлія Буда (Зоркаўская школа), I месца – Юлія Ціхановіч (Германавіцкая СШ).

Першы сакратар раённага камітэта БРСМ Марына Фёдарава павіншавала лідараў з перамогай і адзначыла, што такія мерапрыемствы з’яўляюцца традыцыйнымі для маладзёжнага аб’яднання. За маладымі – будучыня. А значыць, асаблівую ўвагу трэба надаваць творчым, таленавітым і мэтанакіраваным юнакам і дзяўчатам



## “За чысціню мары”

“Лідарамі не нараджаюцца, лідарамі становяцца”. Гэта добра ведаюць вучні Іёдскай СШ. Бо там з лёгкасцю можна знайсці людзей цікавых, творчых, ініцыятыўных.

Такім чалавекам, безумоўна, з’яўляецца вучаніца 11 класа Ілона Недзведзь. 2 гады яна ўзначальвае пярвічную арганізацыю БРСМ Іёдскай СШ. “Чалавек актыўны і мэтанакіраваны, – так скажуць пра дзяўчыну і вучні, і настаўнікі, – сапраўдны школьны лідар і надзейны памочнік педагогаў. Калі яна возьмецца за справу, то абавязкова давядзе яе да канца, ды яшчэ знойдзе сабе аднадумцаў”.

Такім і павінен быць сапраўдны лідар: нераўнадушным, адукаваным, здольным узяць на сябе адказнасць за даручаную справу, камунікабельным, спартыўным. Сваё права ўзначальваць маладзёжную арганізацыю ў школе Ілона даказала на справе. Сакратар пярвічнай арганізацыі – нязменная вядучая ўсіх школьных мерапрыемстваў, яна неаднаразова прымала ўдзел у абласной лідарскай змене БРСМ. Акрамя гэтага, дзяўчына ўзначальвае вучнёўскае самакіраванне.

Добра арганізаваны выхаваўчы працэс у школе – рэзультат працы намесніка дырэктара па асноўнай дзейнасці Алы Антонаўны Даргель і яе маладых, актыўных, ініцыятыўных памочнікаў – вучняў.

Шмат цікавых акцый і конкурсаў праходзіць у Іёдах і зараз. Самыя прыемныя ўражанні і сонечны веснавы настрой прынесла ўсім вучням маладзёжная акцыя “За чысціню мары”, мэта якой – зацікавіць дзяцей, дапамагчы ім не спыняцца перад цяжкасцямі і рабіць усё магчымае для ажыццяўлення сваіх жаданняў. Кожны з удзельнікаў меў магчымасць напісаць сваю мару, прывязаць паштоўку з пажаданнем да паветранага шара і адпусціць у неба. Акцыя аб’яднала дзяцей, дапамагла ім вызначыць сваю мэту ў жыцці.

Згадзіцеся, гэта не так ужо і мала.



**М.Фёдарава**
**першы сакратар райкама БРСМ**

## Юныя валанцёры ў Лужках

Кругласутачны лагер Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі праходзіць у Лужках не ўпершыню, ён па-ранейшаму застаецца папулярным сярод падлеткаў, – паведаміла начальнік лагера, першы сакратар райкама БРСМ Марына Фёдарава. – Стаць валанцёрамі гэтым летам пажадалі 20 юнакоў і дзяўчат – а гэта навучэнцы з гарадскога пасёлка, прадстаўнікі Германавіцкай, Велікасельскай, Більдзюжскай і Гуркаўскай школ.

Трэба адзначыць, што валанцёр – гэта чалавек, які ажыццяўляе пэўную дзейнасць на карысць іншым людзям, аказвае дапамогу тым, каму яна патрэбна. Добра папрацавалі юныя валанцёры ў Лужках: ачысцілі вуліцы ад смецця, пафарбавалі, дзе было неабходна, агароджы, прапалолі кветнікі. Карацей кажучы, паспрабавалі зрабіць так, каб аграгарадок стаў яшчэ больш утульным і прыгожым. А на змену карысным справам прыходзіў час забаў.





Усе дзеці ў нашым лагеры – дружныя і ініцыятыўныя, – падзялілася ўражаннямі вучаніца Германавіцкай сярэдняй школы Ірына Гінько. – Кожны вечар мы збіраліся ля кастра, спявалі песні пад гітару, расказвалі анекдоты і цікавыя гісторыі. Рамантыка гэтых летніх дзён надоўга застанецца ў памяці. У лагеры мы пазнаёміліся і пасябравалі.

Дзевяць дзён ў палатачным лагеры праляцелі як адно імгненне, – адзначыла Каця Жарнасек, якая вучыцца ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе №1. – Асабіста мне вельмі спадабаліся дыскатэкі ў аграгарадку Лужкі. Там мы пазнаёміліся з мясцовай моладдзю, шмат танцавалі, весяліліся.

Сярод валанцёраў і тыя, хто прыязджае ў палатачны лагер не першы годю сярод іх Ільяс Гуліеў – студэнт 3 курса Полацкага гандлёва-тэхналагічнага каледжа. Хлопец ужо трэці раз прыязджаў адпачываць у лагер БРСМ, гэтым летам у якасці выхавальніка. Ён дапамагаў арганізатарам праводзіць гульні і спаборніцтвы, падтрымліваць дысцыпліну і парадак на тэрыторыі "палатачнага гарадка".

Мне вельмі падабаецца ў "Зорным", – гаворыць ён, – таму і прыязджаю сюды ўжо трэці год. Мы купаемся, адпачываем, займаемся спортам. Жыццё ў палатачным лагеры цікавае і багатае на падзеі.

Пастаянную занятасць хлопчыкаў і дзяўчынак на працягу 9 дзён знаходжання ў лагеры "Зорны" забяспечвалі супрацоўнікі райкама БРСМ Марына Фёдарава і Святлана Федуковіч. Шчырыя словы ўдзячнасці за дапамогу ў арганізацыі летняга адпачынку дзяцей яны адрасавалі калектыву Лужкаўскай сярэдняй школы і асабліва кіраўніку гэтай навучальнай установы Ларысе Віктараўне Гаранінай.

Дзецям вельмі спадабалася ў аграгарадку Лужкі, – адзначыла начальнік лагера Марына Фёдарава. – Ужо трэці раз наш палатачны лагер быў размешчаны на тэрыторыі Лужкаўскай сярэдняй школы, і нас заўсёды гасцінна сустракалі, дапамагалі арганізаваць занятасць дзяцей. А работнікі школьнай сталовай смачна кармілі хлопчыкаў і дзяўчынак.

Клапаціліся ў лагеры і пра бяспеку падлеткаў. Напрыклад, каб на тэрыторыю лагера не праніклі пабочныя асобы, пастаянна дзяжурылі супрацоўнікі міліцыі. Усё было зроблена для таго, каб адпачынак дзецям спадабаўся. У выніку так і атрымалася.

У лагеры здорава! Абавязкова прыедзем сюды ў наступным годзе, – адзначылі ўсе без выключэння ўдзельнікі лагера "Зорны."



**БРСМ – для маладых і актыўных!**



На канферэнцыі грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", якая праводзілася 6 красавіка ў раённым Доме культуры, былі падведзены вынікі работы маладзёжнага саюза за апошнія 3 гады і намечаны перспектывы далейшага развіцця. У зале ў гэты дзень прысутнічалі 202 дэлегаты – маладыя жыхары нашага раёна – прадстаўнікі працоўных калектываў і навучальных установ. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел старшыня райвыканкама Мечыслаў Віктаравіч Морхат, выконваючы абавязкі старшыні Віцебскай абласной кантрольнай камісіі БРСМ Аляксандр Лук'янаў, начальнікі аддзелаў раённага выканаўчага камітэта, ветэраны працы і вайны, камсамольцы розных пакаленняў.

Для арганізацыі належнай работы канферэнцыі былі абраны прэзідыум, сакратарыят, мандатная, рэдакцыйная і падліковая камісіі. На пачатку мерапрыемства прадстаўнікі маладога пакалення ўсклалі кветкі ля помніка ахвярам фашызму.



Работа маладзёжнай арганізацыі вядзецца ў многіх накірунках, – паведаміла ў час сваёй справаздачы першы сакратар райкама БРСМ Марына Фёдарава. – Значная ўвага надаецца патрыятычнаму выхаванню моладзі, фарміраванню здаровага ладу жыцця. Вялікая колькасць акцый і мерапрыемстваў накіравана на прадухіленне негатыўных з'яў сярод падлеткаў. Арганізавана дзейнасць добраахвотных дружын. Не забываюць маладыя людзі і пра аказанне дапамогі ветэранам вайны і працы. добра зарэкамендавалі сябе лідарскія праекты – конкурсы "Лідар" і "Школьны марафон", яны дазваляюць выявіць творчых і перспектыўных юнакоў і дзяўчат.

Пра дзейнасць маладзёжнага аб'яднання ў сваіх калектывах расказалі Алена Ганебная (Германавіцкая СШ), Алеся Чарняўская (ААТ "Княж"), і Дзмітрый Туронак (УКП ЖКГ).

З найлепшымі пажаданнямі да прадстаўнікоў маладога пакалення звярнуўся старшыня райвыканкама М.В. Морхат. Кіраўнік раёна адзначыў, што будучыня нашага краю – у руках маладых людзей. Ад іх актыўнасці і працавітасці будзе залежыць паспяховае развіццё раёна. А ініцыятывы юнакоў і дзяўчат заўсёды знойдзе падтрымку ў прадстаўнікоў улады. Задача раённай арганізацыі БРСМ – наладзіць эфектыўную і мэтанакіраваную работу з моладдзю, працягваць узаемадзеянне з ветэранамі вайны і працы. у гэтых людзей ёсць чаму вучыцца. Важны накірунак дзейнасці саюза моладзі – арганізацыя спартыўных мерапрыемстваў і працоўных акцый.

Падзяку ад старшыні райвыканкама і грашовыя прэміі ў памеры 3-х базавых велічынь атрымалі ў гэты дзень найбольш актыўныя прадстаўнікі маладзёжнага аб’яднання. Гэта Уладзімір Цітовіч – вучань 10 класа Іёдскай СШ, Алеся Чарняўская – ветэрынарны ўрач ААТ “Княж” і Дзмітрый Туронак – інжынер-тэхнолаг УКП ЖКГ.

На канферэнцыі быў зацверджаны новы састаў раённага камітэта БРСМ і раённай кантрольнай камісіі, прыняты зварот да моладзі, абраны дэлегаты на справаздачна-выбарную канферэнцыю абласной арганізацыі БРСМ. Прадстаўляць наш рэгіён у Віцебску будуць Марына Фёдарава, Дзмітрый Туронак і Анастасія Гінько. У гэты ж дзень у прысутнасці дэлегатаў адбылося пасяджэнне першага пленума маладзёжнага саюза. У час яго правядзення былі абраны першы і другі сакратары раённага камітэта, зацверджаны састаў бюро. Як і чакалася, узначальваць маладзёжную арганізацыю раёна будзе Марына Фёдарава, другім пазаштатным сакратаром стала настаўніца сярэдняй школы №1 Вольга Падоба.

Самыя ініцыятыўныя і творчыя маладыя людзі ў гэты дзень прымалі віншаванні ад першага сакратара. За актыўны ўдзел у дзейнасці Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі і рэалізацыю маладзёжных праектаў і ініцыятыў Ганаровай граматай райкама БРСМ узнагароджаны сакратары пярвічных арганізацый працоўных калектываў Вольга Рымдзёнак, Святлана Вярцінская, Анастасія Гінько, Яўген Чысцякоў, Алена Курыловіч, а таксама вучні сярэдніх школ №1 і № 2 Ірына Усцінава, Таццяна Кожан, Юлія Бондар, Андрэй Атрахімовіч, Уладзіслаў Русецкі, Юлія Рудак, Крысціна Зялёнка, Крысціна Хашкоўская, Каця Ермаловіч і Марына Апалька.

Завяршылася мерапрыемства святочным канцэртам, які падрыхтавалі работнікі аддзела культуры і маладыя артысты мастацкай самадзейнасці.



**Выбраны першы сакратар**
**(Пленум раённага камітэта ГА “БРСМ”)**

4 мая адбыўся чарговы пленум раённага камітэта грамадскага аб’яднання “БРСМ”.

Па першаму пытанню “Справаздача аб дзейнасці за 4 месяцы 2012 года і перспектывах развіцця аб’яднання” выступіў в.а. першага сакратара ГА “БРСМ” Дзмітрый Туронак.

Па другому, кадраваму, прапанову аб выбранні першага сакратара ўнёс кіраўнік спраў райвыканкама Ю.А. Васілеўскі. Ён прапанаваў членам пленума і прысутным актывістам маладзёжнага руху кандыдатуру Дзмітрыя Туронка. Моладзь падтрымала і аднагалосна пагадзілася. Такім чынам, першым сакратаром раённага камітэта ГА “БРСМ” выбраны Дзмітрый Туронак.

Другім пазаштатным сакратаром раённага камітэта ГА “БРСМ” выбраны Міхаіл Пугаўка.

Аб камсамольскіх справах у гады юнацтва расказаў намеснік старшыні райвыканкама А.А. Цітовіч.

Старшыня райвыканкама М.В. Морхат шчыра павіншаваў Дзмітрыя з новай пасадай і пажадаў маладзёжнаму лідару раённа поспехаў у няпростай рабоце з моладдзю. Таксама Мечыслаў Віктаравіч выказаў уласнае бачанне далейшага развіцця маладзёжнага руху на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна, зрабіў свае заўвагі, накіраваныя на ўмацаванне дзейнасці кожнай маладзёжнай арганізацыі.

Аб прадстаячай выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь расказала начальнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама Л. У. Стома.



## У барацьбе за тытул “Міс БРСМ”

Удзельніцамі раённага конкурсу з такой назвай сталі 5 абаяльных і харызматычных дзяўчат, лідараў школьных пярвічак БРСМ. Гэта Надзея Якімовіч з Зоркаўскай СШ, Арына Жынгель, якая разам са сваёй камандай прадстаўляла аграгарадок Лужкі, Анастасія Сташкевіч з Германавіч, Ірына Буйка, вучаніца Іёдскай СШ-сада і Крысціна Валеўка, прадстаўніца СШ №1, -- менавіта яна і заваявала перамогу.

Трэба сказаць, што стаць лідэрам сярод самых ініцыятыўных т мэтанакіраваных прадстаўніц вучнёўскай моладзі зусім няпроста. Як адзначыў арганізатар мерапрыемства, першы сакратар раённага камітэта БРСМ Дзмітрый Туронак, усе дзяўчаты на належным узроўні падрыхтаваліся да конкурсу, таму ён і атрымаўся вельмі яркім і захапляльным. У час барацьбы за тытул “Міс БРСМ” лідары школьных пярвічак з дапамогай сваіх каманд дэманстравалі таленты ў конкурсе візітак “Знаёмцеся, гэта Я!”, спаборнічалі ў сцэнічным майстэрстве “Году кнігі прысвячаецца”, прадстаўлялі на суд журы свае здольнасці ў конкурсе красамоўства “Экспромт”, тэмы для выступленняў у якім былі аб’яўлены непасрэдна перад пачаткам выпрабаванняў.

Прадстаўленыя на сцэне СШ №1 (а менавіта там праходзіла мерапрыемства) творчыя прэзентацыі і маладзёжныя праекты ўражвалі сваёй разнастайнасцю, высокім узроўнемпадрыхтоўкі. Было бачна, колькі ўсяго карыснага, патрэбнага і добрага зроблена дзецьмі і іх настаўнікамі ў школах нашага раёна. Вялікую колькасць цікавых праектаў, планаў і ідэй яны яшчэ ўвасобяць у жыццё. Усё гэта было адзначана судзейскай камісіяй пры падвядзенні рэзультатаў. А вынікі раённага конкурсу “Міс БРСМ” наступныя: у намінацыі “За талент і аптымізм” перамогу заваявала вучаніца Іёдскай сярэдняй школы-сада Ірына Буйка, “За прыгажосць і абаяльнасць” узнагароджана Надзея Якімовіч з Зоркаўскай СШ , “За маладосць і перспектыву” дыпломам адзначана канкурсантка з аграгарадка Германавічы Анастасія Сташкевіч, а ў намінацыі “За творчасць і ініцыятыву” лепшай стала прадстаўніца Лужкаўскай СШ Арына Жынгель.

А перамогу і званне “Міс БРСМ” у няпростай барацьбе заваявала вучаніца 11 “Б” класа Шаркаўшчынскай СШ №1 Крысціна Валеўка. Як высветлілася, яна закончыла музычную школу па класу гітары, захапляецца музыкай і падарожжамі, выступае на школьнай сцэне ў складзе вакальнага ансамбля “Дзяўчаты” і, безумоўна, надае належную ўвагу вучобе. Крысціна – пераможца многіх раённых алімпіяд.



## За перамогу змагаліся лідары новага пакалення

Раённы этап конкурсу “Лідар – новае пакаленне” дапамог вызначыць самых творчых, ініцыятыўных і энергічных прадстаўнікоў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі сярод вучняў старэйшых класаў. Пры падвядзенні вынікаў найбольш высокую ацэнку журы атрымалі выступленні Вольгі Пастушковай і Ірыны Гінько – прыгожых і абаяльных удзельніц з гарадскога пасёлка і аграгарадка Германавічы. Менавіта гэтыя дзяўчынкі ў час розных выпрабаванняў найлепшым чынам прадэманстравалі свае таленты, лідарскія і арганізатарскія здольнасці, уменне зацікавіць аўдыторыю і знайсці выхад з самай непрадбачнай сітуацыі. А ўжо 22 сакавіка Вольга і Ірына прадстаўлялі Шаркаўшчынскі раён на рэгіянальным этапе конкурсу на лепшага лідара.

Мерапрыемства адбылося ў раённым Доме культуры, за перамогу змагаліся 8 прадстаўнікоў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі з Шаркаўшчынскага, Глыбоцкага, Браслаўскага, Пастаўскага і Міёрскага раёнаў.

На пачатку конкурсных выпрабаванняў з найлепшымі пажаданнямі да ўдзельнікаў звярнулася начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Л.У. Стома. Яна адзначыла, што ў БРСМ прыходзяць лепшыя прадстаўнікі маладога пакалення – перспектыўныя, творчыя і ініцыятыўныя маладыя людзі, якія ў будучым стануць выдатнымі спецыялістамі ў розных сферах дзейнасці. Людміла Уладзіміраўна пажадала юным канкурсантам паспяховых выступленняў і перамогі ў барацьбе за ганаровае званне “Лідара новага пакалення”.

Усе юнакі і дзяўчаты, якія ў гэты дзень выйшлі на сцэну, ужо сталі прызёрамі першага (раённага) этапа спаборніцтваў. Таму і канкурэнцыя сярод лідараў, неглядзячы на юны ўзрост, была вельмі моцнай.

Першы конкурс “Візітка” дазволіў бліжэй пазнаёміцца з удзельнікамі. У ходзе выпрабаванняў юнакі і дзяўчаты з дапамогай груп падтрымкі прадстаўлялі дзейнасць сваіх школьных пярвічак БРСМ, у творчай арыгінальнай форме расказалі пра сябе і свае інтарэсы. Прааналізаваць аратарскія здольнасці выступаючых дапамог конкурс “Дэбаты”. А адно з самых няпростых выпрабаванняў – “Маладзёжныя ініцыятывы” – дазволіла зразумець, якія шляхі вырашэння найбольш актуальных праблем прапануе сучасная моладзь. Канчаткова вызначыць пераможцаў дапамог конкурс-экспромт, падчас якога без папярэдняй падрыхтоўкі ўдзельнікі праводзілі агітацыйную падпісную кампанію на папулярныя маладзёжныя выданні – газеты “Переходный возраст” і “Знамя юности”.

Пры падвядзенні вынікаў начальнік аддзела адукацыі райвыканкама Валянціна Іванаўна Лемяшэўская адзначыла, што вызначыць пераможцаў было няпроста – канкурсанты ў час сваіх выступленняў яскрава прадэманстравалі прысутным: яны – сапраўдныя лідары і таму заслугоўваюць перамогі. А вынікі конкурсу настурныя: 3 месца – Вольга Пастушкова (Шаркаўшчынская СШ №1), 2 месца – Ірына Гінько (Германавіцкая сярэдняя школа). А фартуна ў гэты дзень была на баку глыбачанкі, вучаніцы Дзеркаўшчынскай СШ Кацярыны Малей. Яна ў няпростай барацьбе заваявала пераможнае першае месца. Зрабіць мерапрыемства больш яркім і ўзняць настрой канкурсантам дапамаглі артысты раённага Дома культуры – яны падрыхтавалі для школьных лідараў і іх балельшчыкаў цікавую канцэртную праграму



**Спалучалі навучанне і адпачынак**

Не так даўно ў г. Астрахань праходзіў Міжнародны маладзёжны адукацыйны форум “СеіАс – 2013”, які сабраў лідараў грамадскіх арганізацый і лепшых студэнтаў Расіі, Казахстана, Туркменістана, Ірана, Арменіі, Украіны.

Упершыню запрашэнне да ўдзелу было накіравана і нашай краіне. Гонар прадставіць Беларусь у саставе аб’яднанай дэлегацыі на адукацыйным форуме такога ўзроўню выпаў выконваючай абавязкі першага сакратара Шаркаўшчынскага райкама БРСМ Юліі Палялейка. Яна ж і падзялілася ўражаннямі з чытачамі раённай газеты:

Галоўнай мэтай Міжнароднага форума “СеліАс – 2013” было стварэнне дыскусійнай пляцоўкі паміж моладдзю, дзяржаўнымі структурамі і бізнэсам, дзе любы таленавіты і актыўны чалавекмог сустрэцца з заказчыкам і інвестарам сваіх распрацовак і праектаў, прадэманстраваць уласны патэнцыял. На працягу тыдня ўдзельнікі форума атрымалі грунтоўныя веды па бізнэсу, палітыцы, эканоміцы і іншых накірунках. Адукацыйная частка складалася з такіх заняткаў як “Бізнэс і інавацыі”, “Палітыка і міжнародныя адносіны”, “Экалогія”, “Творчасць”.

Асабліва для мяне запамінальнай была сустрэча з расійскім харэографам Аляксандрам Каргінавым і прачытаная ім лекцыя “Як дабіцца поспеху ў творчай індустрыі”. Цікава і змястоўна праводзілі заняткі са слухачамі Міхаіл Зяленскі – вядучы інфармацыйнай праграмы “Вести – Москва” тэлеканала “Россия-24”, кіраўнік Федэральнага агенцтва па справах моладзі Сяргей Белаконеў, журналіст, палітычны кансультант і пераможца інтэлектуальных гульняў Анатолій Васэрман. Свій адпачынак мы праводзілі ў сумесным дыялозе з актывістамі маладзёжнага руху Расіі і Украіны. Разам ладзілі творчыя імпрэзы і гумарыстычныя капуснікі.

Несумненна, час быў праведзены з карысцю, намі набыты шматгранныя веды, завязалася знаёмства з новымі сябрамі. Наогул, Міжнародны адукацыйны форум “СеліАс – 2013” – гэта ўсебаковая падтрымка таленавітай моладзі для самарэалізацыі і запатрабаванасці ў цяперашні час.

## Сімвалічная сустрэча пакаленняў

6 лістапада, напярэдадні Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі, у раённым Доме культуры прайшоў святочны канцэрт “Гэта наша з табой біяграфія”. Ён адбыўся пад знакам некалькіх важных гістарычных дат: у 2013 годзе споўнілася 95 гадоў Усесаюзнаму Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу моладзі, 96 гадоў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, 50 гадоў студэнцкаму будатрадаўскаму руху.

Да гэтых гістарычных падзей могуць быць розныя адносіны, але бясспрэчна, што яны з’яўляюцца фактамі біяграфіі нашай краіны, нашых дзядоў і бацькоў. Канцэрт стаў месцам сімвалічнай сустрэчы некалькіх пакаленняў, у зале прысутнічалі як пажылыя людзі, так і моладзь. Ужо на ўваходзе ў залу тых, хто ў свій час ствараў камсамольскую гісторыю Шаркаўшчынскага раёна, сустракалі з кветкамі прадстаўнікі БРСМ. Шаноўнымі гасцямі на свяце былі Ядзвіга Баляславаўна Чарвінская, Альдона Іванаўна Корсак, Галіна Нарбертаўна Шарыпа, Галіна Фёдараўна Волах, Ларыса Канстанцінаўна Чарняўская, Мікалай Мікалаевіч і Ліма Францаўна Грабянёк, Юрый Іванавіч Даргель, Іна Дзмітрыеўна Мілянцей, Тамара Барысаўна Грыцкевіч і многія іншыя.

Павіншаваў са святам прысутных старшыня Шаркаўшчынскага райвыканкама Мікалай Ірынархавіч Баговіч:

Хочацца падзякаваць прадстаўнікам старэйшага пакалення за актыўную жыццёвую пазіцыю. Мы ў свой час шмат чаму ў вас навучыліся, вы былі для нас прыкладам. Ну а ў прадстаўнікоў маладога пакалення галоўныя дасягненні і поспехі яшчэ толькі наперадзе. Прыемна адзначыць, што нашы школьнікі дастойна працягваюць працоўныя традыцыі бацькоў: актыўна дапамагаюць гаспадаркам раёна на ўборцы ўраджаю, прымаюць удзел у рэканструкцыі ферм і іншых справах.

Мікалай Ірынархавіч выканаў прыемную місію – уручыў узнагароды за актыўную жыццёвую пазіцыю і вялікі асабісты ўклад у розных сферах дзейнасці БРСМ сакратару пярвічнай арганізацыі ПМС Сяргею Талапіла, сакратару пярвічнай арганізацыі аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Дзіяне Чапулёнак і намесніку загадчыка аддзела арганізацыйнай і праграмнай дзейнасці Віцебскага абласнога камітэта ГА “БРСМ”, куратару Шаркаўшчынскага раёна па рабоце ГА “БРСМ” Дзмітрыю Туронку.

У сваю чаргу Дзмітрый Туронак расказаў пра дзейнасць і дасягненні маладзёжнай арганізацыі ў вобласці і ўручыў граматы Віцебскага абласнога камітэта ГА “БРСМ” за вялікі асабісты ўклад у развіццё маладзёжных праграм і праетаў БРСМ Іне Сямёнаўне Пучынскай і Марыі Пратасьеўне Фёдаравай.

Сваімі ўспамінамі пра актыўны ўдзел камсамольцаў у жыццм раёна падзяліўся былы першы сакратар Шаркаўшчынскага райкама камсамола Георгій Мікалаевіч Дубоўскі.

Па выніках школьнага працоўнага семестра 2013 года Віцебская вобласць была прызнана лепшай па арганізацыі занятасці школьнікаў. Ёсць у гэтым і заслуга Шаркаўшчынскага раёна, у якім працавалі 33 школьныя атрады. За актыўны ўдзел у арганізацыі часовай працоўнай занятасці школьнікаў “Працоўны семестр-2013” выконваючая абавязкі першага сакратара раённага камітэта ГА “БРСМ” Юлія Палялейка ўручыла граматы Іёдскай ДС-СШ, Зоркаўскай СШ і Гуркаўскай БШ. Таксама граматы атрымалі актыўныя ўдзельнікі працоўных атрадаў дадзеных навучальных устаноў: Ілля Язёнак (Зоркаўская СШ), Кацярына Краснадубская (Гуркаўская БШ) і Дар’я Сідарава (лепшы камандзір працоўнага атрада Іёдскай ДС-СШ). Падзякай Шаркаўшчынскага РК ГА “БРСМ” была ўзнагароджана педагог-арганізатар Радзюкоўскай БШ Анна Пятроўна Ермакова.

І канечне, на канцэрце гучалі песні, якія былі папулярнымі ў савецкай дзяржаве, песні пра маладосць, камсамол, вясну, ідэалы сяброўства, патрыятызму – усё тое, што застаецца надзённым і для сённяшняй моладзі.

## Грамадска-карысная дзейнасць

У жыцці актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ёсць цікавыя формы работы, якія патрабуюць ініцыятывы, імкнення да самасцвярджэння і праяўлення самастойнасці. Інтарэс да сумеснай грамадска-карыснай дзейнасці выклікала рэспубліканская акцыя “Аднаўленне святыняў Беларусі”, удзел у якой прынялі і члены раённай арганізацыі ГА “БРСМ”. Юнакі і дзяўчаты ў адзін з кастрычніцкіх дзён праводзілі работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі каля ўзведзенай капліцы на могілках вёскі Палялейкі. Разам з дарослымі, рабочымі гаспадарчай группы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, яны разраўноўвалі прывезены чарназём і рыхтавалі глебу пад будучыя газоны, каб у хуткім часе тэрыторыя вакол капліцы набыла прывабны выгляд.



**Школьны будаўнічы атрад**

Зараз у самым разгары летнія канікулы. Школьнікі адпачываюць, набіраюць сілы да новага навучальнага года. А вось вучні дзясятага класа Іёдскай ДС-СШ, аб'яднаўшыся ў будаўнічы атрад, з 23 чэрвеня па 18 ліпеня працавалі на жывёлагадоўчых аб'ектах ААТ "Буеўшчына". Па заключанай дамоўленасці паміж гаспадаркай і навучальнай установай дзевяць старшакласнікаў займаліся добраўпарадкаваннем малочнатаварнай фермы ў Варонцы, а затым прыводзілі ў належны выгляд прылягаючую тэрыторыю аб'ектаў жывёлагадоўлі ў аграгарадку Іёды. Сельгаспрадпрыемства ўжо часткова выплаціла юнакам і дзяўчатам заробак за выкананыя работы.

У перадапошні дзень працы будатрада павіншаваць лепшых вучняў завітала першы сакратар райкама БРСМ Юлія Палялейка. Яна ўручыла Пахвальныя лісты Дар'і Сідаравай і Марыне Алексяёнак. А ўсім астатнім – салодкія пачастункі і невялікія сувеніры, падзякавала школьнікам за працу.

У рамках рэспубліканскай міжведамаснай прафілактычнай акцыі "Клопат" з вучнямі сустрэўся і правёў гутарку ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх РАУС Іван Пачкоўскі, які засяродзіў увагу школьнікаў на правілах бяспечных паводзін у час летніх канікулаў.



**“Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня”**

19 і 20 студзеня ў Мінску ў фармаце адкрытага дыялогу “Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня” прайшоў 42-гі з’езд Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, які сабраў каля трох тысяч чалавек з усёй краіны. У складзе дэлегацыі ад Віцебскай вобласці на маладзёжным форуме прысутнічала і першы сакратар Шаркаўшчынскага раённага камітэта БРСМ Юлія Протас.

Скажыце, Юлія, што папярэднічала правядзенню з’езда Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ў нашай сталіцы?

Гэтай значнай падзеі папярэднічала правядзенне адкрытага дыялогу “Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня” – рэспубліканскага праекта, старт якому быў дадзены ў пачатку верасня мінулага года. Яго мерапрыемствы праходзілі паэтапна: спачатку ў раёнах і гарадах, затым у абласных цэнтрах, а заключны рэспубліканскі этап адбыўся 20 студзеня. Мэтай адкрытага дыялогу стала фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі моладзі, а ўзнятыя тэмы, праблемы і пытанні ў далейшым стануць асновай для вызначэння новага накірунку работы з моладдзю.

Вядома, што маладзёжны форум праходзіў на працягу двух дзён. У якіх мерапрыемствах прынялі ўдзел дэлегаты з’езда 19 студзеня?

42-гі з’езд БРСМ стартаваў з патрыятычнай акцыі “Мы памятаем і ганарымся” на Плошчы Перамогі, куды прыйшлі ветэраны, прадстаўнікі шматлікіх грамадскіх арганізацый і моладзь. Перад прысутнымі выступіў выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК БРСМ Андрэй Белякоў, які ў сваёй прамове заклікаў памятаць пра тых, хто загінуў на палях Вялікай Айчыннай вайны. Дарэчы, працягам дадзенай акцыі ў далейшым стануць вахты памяці, творчыя фестывалі, конкурсы патрыятычнай песні, сустрэчы з ветэранамі і іншыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 70-годдзя Вялікай Перамогі, якія пройдуць па ўсёй краіне.

Пра што ішла гаворка і на чым будаваўся дыялог моладзі і ўлады ў асноўны дзень з’езда 20 студзеня?

На форуме ўзнімаліся самыя разнастайныя пытанні маладзёжнай палітыкі, яе кадравага забеспячэння. Закраналіся тэмы атрымання адукацыі, падтрымкі ў арганізацыі работы і набыцця жылля маладымі сем’ямі. На гэтыя і іншыя пытанні кампетэнтныя адказы даваў Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка ў другі дзень форуму: у фармаце адкрытага дыялогу размову вёў з маладзёжнымі актывістамі – дэлегатамі з’езда. У сваім звароце да моладзі Прэзідэнт дзяліўся з намі ўласным напрацаваным вопытам, поглядам на надзённыя праблемы, тлумачыў шляхі іх вырашэння.

Сёлетні год аб’яўлены Годам моладзі ў Беларусі. Што ў гэтым накірунку запланавана зрабіць актывістамі самай масавай маладзёжнай арганізацыі краіны і што плануецца правесці ў нашым раёне ў бягучым годзе з непасрэдным удзелам райкама БРСМ?

Прынята рашэнне, якое прадугледжвае рэалізацыю шэрагу мерапрыемстваў, якія будуць карыснымі для нашага грамадства, каб аб’яўлены год запомніўся многім наступным пакаленням. У нас, напрыклад, сёлета пройдуць сельскагаспадарчы конкурс “Уладар сяла”. Конкурс патрыятычнай песні “Песні юнацтва нашых бацькоў”, ваенна-патрыятычная гульня “Зарніца”, конкурс маладых аўтааматараў. У сваёй рабоце мы прадоўжым пачатую летась практыку правядзення адкрытага дыялогу паміж прадстаўнікамі ўлады і моладдзю. У межах міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” прымем удзел у Днях моладзі. Акрамя гэтага, плануецца правесці на працягу года грамадзянска-патрыятычныя, культурна-масавыя і спартыўна-забаўляльныя акцыі з далучэннем да іх шырокага кола ўдзельнікаў розных катэгорый насельніцтва Шаркаўшчынскага раёна.

З’езд прадугледжваў выбары новага кіраўніка ЦК БРСМ. Хто ім стаў?

Так, на 42 з’ездзе абраны першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Ім стаў Андрэй Белякоў, які да гэтага часу займаў пасаду другога сакратара. Абраны таксама і Цэнтральны камітэт арганізацыі ў складзе 27 чалавек. Акрамя гэтага ўнесены змяненні і дапаўненні ў статут арганізацыі. У прыватнасці, зацверджаны новы ўзор маладзёжнага білета – ў выглядзе банкаўскай карты.

**Падарункі для Сафіі**

На тэрыторыі нашага раёна ў апошнія гады захоўваецца цудоўная традыцыя – віншаваць матуль, у якіх дзеткі нарадзіліся напярэдадні або ў дзень святкавання галоўных дзяржаўных датаў. Вось і ў гэтым годзе, напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, самыя шчырыя віншаванні, кветкі і падарункі ад раённай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прымалі шаркаўчанка Марына Яфімава і яе навароджаная дачушка Сафія, якая з’явілася на свет 29 чэрвеня гэтага года. У сям’і Яфімавых гэта ўжо другое дзіцяці. Дома разам з астатнімі членамі сям’і сваю матулю і маленькую сястрычку вельмі чакае старэйшы брат Раман, якому хутка споўніцца тры гады.



А напярэдадні Дня Незалежнасці нашай краіны, акрамя родных, сяброў і проста знаёмых з нараджэннем дачушкі маладую маці павіншавалі галоўны ўрач Шаркаўшчынскай ЦРБ Станіслаў Стома, першы сакратар раённага камітэта БРСМ Юлія Протас і адна з удзельніц гэтай маладзёжнай арганізацыі Алеся Русецкая, а таксама акушэрка радзільнага аддзялення Іна Шылёнак (на здымку).

Віншаванні ў радзільным аддзяленні цэнтральнай раённай бальніцы праходзілі ў межах акцыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі “Падары навароджанаму вышыванку”. Прыгожы і памятны сувенір з імем і датай нараджэння маленькай Сафіі, а таксама паштоўку з вышыўкай для ўдзельнікаў акцыі падрыхтавала метадыст раённага Цэнтра рамёстваў Ірына Груніна.

**“Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня”**

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі стаў ініцыятарам правядзення адкрытага дыялога “Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня”. Старт праекта быў дадзены ў дзень заснавання БРСМ – 6 верасня. Яго мерапрыемствы праходзяць паэтапна: спачатку ў раённах і гарадах, затым у абласных цэнтрах, а рэспубліканскі этап плануецца правесці напрыканцы сёлетняга года. Мэтай адкрытага дыялогу з’яўляецца фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі моладзі. Узнятыя тэмы, праблемы і пытанні павінны ў далейшым стаць асновай для вызначэння новага накірунку ў рабоце з моладдзю. Адкрыты дыялог праходзіць паўсюдна па краіне напярэдадні важных падзей – з’езда ГА “БРСМ” і Года моладзі, якім аб’яўлены наступны 2015 год.

У сярэдзіне снежня ў СШ №1 гарадскога пасёлка па ініцыятыве райкама БРСМ адбылася сустрэча маладзёжных актывістаў раёна з работнікамі райвыканкама, спецыялістамі шматлікіх служб і праваахоўных органаў, якія выступілі ў ролі экспертаў і адказвалі на пытанні, узнятыя прадстаўнікамі маладога пакалення. На сустрэчы прысутнічалі першы сакратар райкама БРСМ Ю.Л. Протас, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Л.У. Стома, намеснік начальніка гэтага аддзела І.А. Іваноў, намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама К.Р. Міхнёнак, начальнік аддзела занятасці насельніцтва і сацыяльна-працоўных адносін упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Л.М. Бука, участковы інспектар па справах непаўналетніх І.І. Пачкоўскі, урач псіхіятр-нарколаг К.В. Галай, дырэктар фізкультурна-спартыўнага клуба “Шаркаўшчына” Ю.С. Каплуноўская і інструктар-метадыст гэтага клуба В.А. Шадрына.

На пачатку правядзення адкрытага дыялогу прысутным паказалі відэаролік, у якім дэманстраваліся згубныя вынікі ўздзеяння інтэрнэт-залежнасці на людзей, асабліва на моладзь. З каментарыямі па дадзенай праблеме выступіў І.І. Пачкоўскі, які папярэдзіў падлеткаў аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за форму і змест размешчаных у інтэрнэт-прасторы відэа- і фотаматэрыялаў, прывёў канкрэтныя прыклады падобных правапарушэнняў, зафіксаваных у мінулым годзе на тэрыторыі нашага раёна. Свой пункт погляду на вырашэнне гэтай праблемы выказала і К.В. Галай.

Прысутным экспертам было зададзена пытанне: якія існуюць умовы для раскрыцця талентаў моладзі ў нашым раёне? Поўны і абгрунтаваны адказ на яго далі Л.У. Стома, І.А. Іваноў і К.Р. Міхнёнак. Многім вядома, што ў нас кожны год праходзяць творчыя конкурсы, інтэлектуальныя гульні і спартыўныя спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў. Для працоўнай моладзі ў кожным калектыве праводзяцца конкурсы прафесійнага майстэрства, дзе пераможцам і прызёрам для заахвочвання ўручаюць граматы, каштоўныя падарункі і грашовыя прэміі. Сёлета ў Германавічах прайшоў школьны экалагічны лагер у межах праекта “Малыя рэкі – вялікія праблемы”, які сабраў вучняў Шаркаўшчынскага, Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў. Бдзеці мелі выдатную магчымасць не толькі бліжэй пазнаёміцца, але і заняцца агульнай карыснай справай па захаванні экасістэмы прытокаў ракі Дзісна. Школьнікі падчас адкрытага дыялогу выказалі жаданне. Каб у будучым годзе для іх быў арганізаваны на тэрыторыі раёна падобны экалагічны лагер, які б стаў пляцоўкай для наладжвання сяброўскіх зносін, вывучэння і зберажэння прыроды роднага краю. У ходзе мерапрыемства закраналіся пытанні спартыўна-аздараўленчага характару, працаўладкавання непаўналетніх у час канікулаў, наяўнасці льгот для маладых спецыялістаў і іншыя. На кожнае зададзенае пытанне прысутныя атрымалі змястоўны адказ. Як паведаміла ў канцы сустрэчы першы сакратар райкама БРСМ Ю.Л. Протас, узятыя пытанні і пажаданні не застануцца па-за ўвагай зацікаўленных дзяржаўных структур. А стануць фундаментам для вызначэння новага сучаснага вектара ў рабоце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Падчас другой часткі мерапрыемства былі падведзены вынікі раённага этапа працоўнага семестра 2014 года па арганізацыі другаснай занятасці моладзі. Узнагароджаны дыпломамі і каштоўнымі падарункамі школьныя атрады, якія прымалі актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні тэрыторый вытворчых аб’ектаў і ў час уборкі ўраджаю ў сельгаспрадпрыемствах. Па рэкамендацыі Віцебскага абласнога камітэта ГА “БРСМ” за актыўны ўдзел у мерапрыемствах раённага, рэгіянальнага і абласнога ўзроўняў, а таксама за ўдзел у выставе-прэзентацыі інавацыйных праектаў “100 ідэй для Беларусі” каштоўным падарункам узнагароджаны калектыў вучняў Германавіцкай сярэдняй школы.

**Увлекательный “Автобатл” в Шарковщине**

Утро 7 мая для молодых автолюбителей выдалось волнительным. Причина тому – демонстрация водительского мастерства в районном конкурсе «Автобатл», посвящённом Дню Государственных герба и флага Республики Беларусь и Дню Победы в Великой Отечественной войне. Побороться за звание лучших на базе автошколы ДОСААФ прибыло 12 команд, двенадцать парней и девять девушек из разных сельхозпредприятий и организаций нашего района.

Началось всё, как и полагается, с построения, на котором был представлен состав членов жюри: главный судья соревнования Андрей Вальдемарович Рутковский, мастера производственного обучения по управлению механическим транспортным средством Шарковщинско-Миорской межрайонной организационной структуры ДОСААФ Александр Курилович, Артур Молявко, Чеслав Алешкевич, Анатолий Денисов, инспектор ДПС отделения ГАИ Шарковщинского РОВД Дмитрий Кравченко и старший инспектор по административной практике отделения ГАИ Шарковщинского РОВД Ирина Ворона, участковый инспектор милиции ООПП Шарковщинского РОВД Игорь Кукуть, заместитель начальника отдела идеологической работы, культуры и по делам молодёжи Шарковщинского райисполкома Игорь Иванов, первый секретарь Шарковщинского РК ОО «БРСМ» Юлия Протас.

С приветственным словом к участникам обратились Игорь Иванов и Андрей Рутковский, они также рассказали о правилах конкурса, прохождения трассы и пожелали всем успехов и внимательности.

Конкурс начался с представления командами девизов. Участники в оригинальной форме выступали со своей версией: кто-то придумал целое стихотворение, кто-то подошёл к этому с чувством юмора, а кто-то с фантазией. Первое место в этом конкурсе у команд ОАО «Шарковщинский агротехсервис», ОАО «Ельня-Агро», УЗ «Шарковщинская ЦРБ».

После проведения жеребьёвки участники были поделены на три группы. Пока одни отвечали на вопросы викторины, посвящённой Дню Государственных герба и флага нашей республики, другие выполняли теоретическое задание на знание правил дорожного движения, оказания медицинской помощи, безопасности движения, третьи приступили к практическому заданию. Основу практической части составляло 7 этапов дистанции на легковом автомобиле ДОСААФ: «бокс», «парковка», «круг», «змейка», «эстафета», «разворот на участке ограниченных размеров» и «стоп-линия». Судейская коллегия ознакомила с трассой и предоставила каждому конкурсанту возможность опробовать дистанцию.

Мастерство водителей поражало и вызывало уважение: проходить на скорости крутые виражи «змейки» в сантиметрах от вешак могли  только хорошие водители. Да и заезды в узкие боксы по зеркалам совершались уверенно и быстро. Чтобы демонстрировать подобное, нужно водительское мастерство и чувство руля. А это уже, согласитесь, клас.

Победителями данного вида среди мужчин стали Александр Рубникович (ОАО «Княж», 1-е место), Павел Демидко (РОЧС, 2-е место), Денис Барило (ОАО «Шарковщинский агротехсервис», 3-е место). Мнение, бытующее среди мужчин об их превосходстве на дороге, старалась оспорить прекрасная половина человечества. И у них это прекрасно получилось. Среди женщин 1-е место заняла Юлия Каплуновская (УКП ЖКХ), 2-е место – Юлия Киселёва (КУПСХП «Городец»), 3-е место – Юлия Лукьянёнок (УЗ «Шарковщинская ЦРБ»).

Теоретическое же задание включало в себя тестирование по трём билетам состоящих из 10 вопросов на компьютере. Время, затраченное участниками на выполнение, фиксировалось судьями. За каждый неправильный ответ начислялся штраф – 50 баллов, а сам конкурс оценивался по наименьшему количеству штрафных баллов и затраченному времени. 1-е место среди мужчин занял Александр Рубникович, 2-е место – Дмитрий Ковалёв (ОАО «Доваторский»), 3-е место – Павел Демидко. Среди девушек не было равных Анастасии Буда (отдел идеологической работы, культуры и по делам молодёжи райисполкома), 2-е место у Юлии Каплуновской, 3-е место у Юлии Киселёвой. Среди команд места распределились следующим образом: 1-е место заняла команда КУПСХП «Городец» (Владимир Жалейко и Юлия Киселёва). Молодцы ребята, прекрасный результат, не зря об их участии в конкурсе при возникновении спорного вопроса с руководством КУПСХП «Городец» ходатайствовал председатель райисполкома Николай Иринархович Богович. 2-е место – у команды УКП ЖКХ (Александр и Юлия Каплуновские), 3-е место – команда УЗ «Шарковщинская ЦРБ» (Владимир Грицив и Юлия Лукьянёнок).



Молодые автолюбители демонстрируя готовность принять эстафету у поколения победителей в Великой Отечественной войне и, как они, бороться за справедливость, за свои национальные интересы, в знак уважения к родной стране выступали на автомобиле с гербом и развевающимся на ветру флагом независимой и суверенной Беларуси.

В классе теоретических занятий автошколы участники демонстрировали знание того, что символизируют цвета и орнамент нашего флага, какой глубокий смысл заложен в изображении герба, письменно вспомнили слова припева гимна нашей Родины. Лучшим среди мужчин стал – Владимир Грицив (УЗ «Шарковщинская ЦРБ»), второе место – у Александра Рубниковича, на третьем – Александр Каплуновский. Среди женщин не было равных по количеству правильных и точных ответов Анастасии Буда, 2-е место заняла Юлия Лукьянёнок, 3-е место – у Юлии Киселёвой.

Также дипломами и призами награждены участники конкурса в номинации «Самая молодая участница» (Анастасия Буда) и «Самый молодой участник» (Валерий Алексеёнок, ОАО «Буевщина»).

Победители были награждены ценными призами и дипломами.



**У Шаркаўшчыне прайшоў рэгіянальны этап конкурсу «Школьны марафон»**

У 2015 годзе на базе сярэдняй школы № 2 гарадскога пасёлка праходзіў рэгіянальны этап конкурсу “Школьны марафон” на лепшую пярвічную арганізацыю Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Сёлета ў чарговы раз гасцінная шаркаўшчынская зямля запрасіла да сябе каманды-ўдзельніцы школьных маладзёжных актывістаў з СШ № 2 г. Глыбокае і Падсвільскай СШ Глыбоцкага раёна, Браслаўскай гімназіі і Дрысвяцкай ДС-СШ Браслаўскага раёна, Сіцькоўскай СШ Міёрскага раёна, Гуцкай СШ Пастаўскага раёна. Наш раён прадставілі маладзёжныя актывісты Германавіцкай СШ. У глядзельнай зале раённага Цэнтра культуры сабраліся самыя таленавітыя, творчыя і знаходлівыя вучні, каб паспрачацца за званне лепшай пярвічнай арганізацыі БРСМ.



А ацэньвала конкурсную праграму журы ў складзе намесніка начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Іны Мар’янаўны Шынкевіч, старшыні раённай ветэранскай арганізацыі Галіны Мікалаеўны Філатавай, дырэктара раённага Цэнтра культуры Аксаны Паўлаўны Сініцы і метадыста раённага Цэнтра дзяцей і моладзі Наталлі Сямёнаўны Шакялеўскай.

Конкурс складаўся з трох этапаў, першым з якіх быў “Знаёмцеся – гэта мы!”. Каманды прадстаўлялі на сцэне творчыя выступленні, якія адлюстроўвалі дзейнасць пярвічак, гісторыю і традыцыі, пераемнасць і сувязь пакаленняў. Для арыгінальнасці выступлення ўдзельнікі каманд прымянялі акцёрскае майстэрства, паказвалі сваё ўменне працаваць з аўдыторыяй.

На другім этапе “Лідар-сюрпрыз” дэманстравалася цеснае і гарманічнае ўзаемадзеянне паміж сабой дуэта ў складзе капітана каманды і дарослага лідара. Дуэты выступалі з творчымі нумарамі і выкарыстоўвалі любыя жанры – песенны, танцавальны. Выступленне некаторых удзельнікаў будавалася на гісторыка-патрыятычным выхаванні, іншыя дэманстравалі дабрачынны накірунак ў дзейнасці сваёй пярвічкі.

Апошні этап меў назву “Крыніцы мудрасці”. Гэта была прэзентацыя кніг беларускіх аўтараў. Выступленне каманд будавалася на кароткім расказе (да пяці хвілін) пра кнігу, каб данесці да гледача сэнс і сутнасць зместу таго або іншага твора, зацікавіць прысутных яго чытаннем. Гэта з’яўлялася своеасаблівай рэкламай твораў, якая павінна здзіўляць, прыцягваць увагу да фактаў, сюжэтнай лініі, да персанажаў. Удзельнікі конкурсу прэзентавалі кнігі як беларускіх класікаў – Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”, Івана Мележа “Людзі на балоце”, Аляксея Дударава “Вечар”, Васіля Быкава “Пакахай мяне, салдацік”, Максіма Гарэцкага “Літоўскі хутарок”, так і сучасных аўтараў – Андрэя Федарэнкі “Афганская шкатулка” і Уладзіміра Мажылоўскага “Друеўскі ваўкалак”.

Членам журы даволі складана было выявіць пераможцу рэгіянальнага этапа, бо выступалі самыя лепшыя і грунтоўна падрыхтаваныя каманды-прадстаўнікі суседніх раёнаў. Тым не менш, пасля працяглага абмеркавання, выстаўлення і складання балаў трэцяе месца занялі маладзёжныя актывісты з Падсвільскай СШ Глыбоцкага раёна. “Серабро” рэгіянальнага этапа дасталася камандзе Браслаўскай гімназіі. Дыпломам за першае месца ўзнагароджана пярвічная арганізацыя БРСМ Германавіцкай сярэдняй школы. Менавіта нашым землякам у хуткім часе трэба будзе прадстаўляць заходні рэгіён Віцебшчыны на абласным этапе рэгіянальнага конкурсу “Школьны марафон”. Пажадаем Германавіцкім маладзёжным актывістам удалага, дастойнага і пераможнага выступлення!



**Профилактика наркомании**

В начале марта в стране отмечали Всемирный День борьбы с наркоманией и наркобизнесом. В рамках акции «Осторожно! дороГа в АД!» совместное профилактическое мероприятие для ребят 8-11 классов провели райком БРСМ, Шарковщинское отделение Департамента охраны МВД Республики Беларусь, Шарковщинское РОВД.

В начале командир взвода милиции Александр Орешков провел экскурсию для школьников, рассказал им о работе отделения, участии в различных районных и областных соревнованиях, ознакомил с характеристиками спецсредств и средств связи. Затем юношам продемонстрировали показательное выступление кинолога и собаки. В учебном классе здания прошла демонстрация видеоролика «Под грифом «Смертельно», направленного на профилактику распространения наркомании. Об ответственности за приобретение, хранение, распространение наркотиков выступил инспектор ИДН Шарковщинского РОВД Иван Викторович Мацкевич. В конце желающие задавали вопросы и получили на них исчерпывающие ответы от правоохранительных органов.



**Акция “Не дай себя обмануть”**

В сентябре ко Дню пожилых людей представители районного отделения дневного пребывания для граждан пенсионного возраста, Шарковщинского РОВД, райкома БРСМ провели совместную акцию «Не дай себя обмануть!» в рамках республиканской благотворительной акции «Мы выбираем помощь пожилым людям». Данная акция проходила с целью профилактики преступлений в отношении граждан престарелого возраста. Особое внимание уделялось тем, кто проживает совместно с лицами, состоящими на профилактических учётах. Подобная категория подучётных, как правило, асоциальные люди, проживающие с престарелыми родителями, зачастую за их счёт. Именно от них можно ожидать совершения противоправных действий. Задачей правоохранительных органов является своевременное пресечение негатива. Принимаются меры и по обеспечению сохранности имущества пожилых людей. Такие проводимые профилактические мероприятия позволяют ориентировать на профилактику преступных деяний.

В своём выступлении начальник отделения охраны правопорядка и профилактики Шарковщинского РОВД Пётр Антонович Пачковский также отметил, что основным объектом социального мошенничества становятся, как правило, люди пожилого возраста, социально незащищённые слои населения. Злоумышленники легко входят в доверие к гражданам и, реализуя свой преступный умысел, зачастую лишают людей последних средств. С каждым разом мошенники действуют всё более изощрённо. Он подробно рассказал о наиболее распространённых преступных схемах и призвал присутствующих к бдительности.

Первый секретарь райкома БРСМ Юлия Протас и заведующая отделением дневного пребывания для граждан пожилого возраста Светлана Тарарако также призвали к бдительности и осторожности, рекомендовали по всем поступающим подозрительным звонкам незамедлительно сообщать в отделение милиции, а от пришедших в дом незнакомцев потребовать предоставить подтверждающие документы.

В заключение представители данной акции раздали присутствующим подготовленные памятки, предупреждающие о случаях мошенничества.



## За маладымі – будучыня раёна

У Дзень Канстытуцыі, 15 сакавіка, 22 маладыя жыхары Шаркаўшчынскага раёна атрымалі свой першы ў жыцці галоўны дакумент – пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі па ўсёй краіне прайшла акцыя “Мы – грамадзяне Беларусі!”. Урачыстае мерапрыемства з гэтай нагоды адбылося ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе № 2. Яно стала адметным і памятным для юнакоў і дзяўчат.

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Уладзімір Серафімавіч Шпец павіншаваў маладых людзей са святам. У прыватнасці, ён сказаў, што гэта падзея вельмі знакавая і важная для тых, хто сёння атрымлівае пашпарт. Быць грамадзянінам нашай краіны ганарова і, разам з тым, адказна. Юнакам і дзяўчатам ён пажадаў годна несці праз усё жыццё пачуццё любові да Айчыны, да роднай зямлі, сваімі справамі і карыснымі ўчынкамі пацвярджаць ганаровае званне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Пасля Уладзімір Серафімавіч разам са старшым інспектарам групы па грамадзянству і міграцыі РАУС Таццянай Гардзееўнай Марозавай уручылі шаркаўчанам, якія дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, пашпарты.

Ад імя тых, хто ў Дзень Канстытуцыі атрымаў галоўны ў жыцці дакумент, да прадстаўнікоў раённай улады і ўсіх прысутных звярнулася вучаніца сярэдняй школы №1 гарадскога пасёлка Дар’я Маляўка. Дзяўчына запэўніла, што маладыя грамадзяне нашай незалежнай краіны будуць выдатна вучыцца і дастойна працаваць на карысць Радзімы. Актыўна праяўляць сябе ў асабістым і грамадскім жыцці.

Напрыканцы памятнага мерапрыемства першы сакратар райкама БРСМ Юлія Протас павіншавала юнакоў і дзяўчат з адметнай падзеяй у іх жыцці, дала наказ маладым шаркаўчанам быць дастойнымі грамадзянамі і патрыётамі нашай краіны. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці сярэдняй школы № 2 падрыхтавалі невялікую музычную праграму, у якой гучалі песні пра нашу любімую незалежную краіну – Рэспубліку Беларусь.

## Прайшлі выбары ў другі склад Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна

У вялікай зале райвыканкама 14 чэрвеня прайшлі выбары ў другі склад Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна. 25 юнакоў і дзяўчат — вучняў школ Шаркаўшчынскага раёна — сталі членамі гэтага прадстаўнічага органа пры раённым выканаўчым камітэце. У першым пасяджэнні Маладзёжнай палаты прынялі ўдзел старшыня райвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч Ламака, старшыня раённага Савета дэпутатаў Уладзімір Серафімавіч Шпец, начальнікі аддзелаў райвыканкама, старшыні сельскіх Саветаў.

— Дарагія юнакі і дзяўчаты, 11 сакавіка 2015 года пачаў сваю работу першы склад Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна, — сказаў у сваім выступленні старшыня райвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч Ламака. — Асноўнымі яго задачамі былі: развіццё і здзяйсненне маладзёжных ініцыятыў, прадастаўленне права ва ўдзеле рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, рэалізацыя сацыяльна-значымых праектаў на раённым узроўні і іншыя. Маладзёжная палата стала ініцыятарам правядзення шматлікіх праектаў у нашым раёне. Члены палаты пастаянна арганізоўвалі сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, добраўпарадкоўвалі месцы воінскіх пахаванняў і абеліскі, пашыралі валанцёрскі рух, эфектыўна рэалізавалі экалагічны праект “Малыя рэкі — вялікія праблемы”. Сёння моладзь раёна — гэта асноўны ўдзельнік культурна-масавых і спартыўных свят. Гэтым яны праяўляюць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю. Жадаю вам, прадстаўнікі маладага пакалення, рэалізацыі ўсіх намечаных планаў!

Затым Дзмітрый Міхайлавіч уручыў пасведчанні членаў Маладзёжнай палаты 25-ці юнакам і дзяўчатам.

З павесткай дня выступіла выконваючая абавязкі першага сакратара райкама БРСМ Анна Зайцава. Асноўнымі пытаннямі сталі выбранне страшыні і намесніка Маладзёжнай палаты, выбранне старшынь пастаянных камісій, зацвярджэнне плана работы Маладзёжнай палаты на 2017 год і іншыя.

На галасаванне па выбарах старшыні Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна было вынесена шэсць кандыдатур. Гэта вучаніца 9 класа Лужкаўскай СШ Крысціна Морхат, вучаніца 9 класа Радзюкоўскай БШ Яна Лук’янёнак, вучаніца 11 класа Германавіцкай СШ Карына Мядзелец, вучань 10 класа СШ № 1 Дзмітрый Гінько, вучаніца 10 класа СШ № 2 Ксенія Лук’янёнак і вучаніца 10 класа СШ № 1 Дар’я Машара.

У выніку большасць галасоў было аддадзена вучаніцы 11 класа Германавіцкай СШ Карыне Мядзелец. З выбраннем на пасаду старшыні Маладзёжнай палаты Карыну павіншаваў кіраўнік раёна.

Намеснікам старшыні выбрана вучаніца 10 класа СШ № 2 Ксенія Лук’янёнак. Пастаянную камісію па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню, прафілактыцы правапарушэнняў і арганізацыі дасуга моладзі ўзначаліў вучань 10 класа СШ № 1 Дзмітрый Гінько. Старшынёй пастаяннай камісіі па сувязях з грамадскімі арганізацыямі, СМІ, развіццю валанцёрскага руху і пытаннях экалогіі аднагалосна выбрана вучаніца 9 класа Лужкаўскай СШ Крысціна Морхат. Вучаніца 10 класа СШ № 1 Дар’я Машара ўзначаліла пастаянную камісію па пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі і профарыентацыі школьнікаў.

— Я выказваю вялікую ўдзячнасць за аказаны мне вялікі давер, — сказала ў адрас прысутных старшыня Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна Карына Мядзелец. — Разам мы будзем імкнуцца арганізаваць цікавае, карыснае і насычанае жыццё нашай моладзі, бо наперадзе шмат маштабных і разнастайных ідэй, якія мы абавязкова ажыццявім на карысць краіны і раёна.

Закончылася першае пасяджэнне Маладзёжнай палаты Шаркаўшчынскага раёна другога саставу ўскладаннем кветак да помніка загінуўшым воінам і партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны.



## Прыемныя сюрпрызы

Паўсюдна па краіне ў рамках рэспубліканскай акцыі “Нашы дзеці” праходзяць мерапрыемствы з віншаваннямі хлопчыкаў і дзяўчынак з Навагоднімі святамі і Калядамі. Цудоўную магчымасць сустрэць Дзеда Мароза і Снягурачку з падарункамі ў сваім доме 31 снежня атрымалі дзеці з малазабяспечанных сем’яў у гарадскім пасёлку і раёне. Падобнае мерапрыемства стала сумеснай задумкай райкама БРСМ, камісіі па справах непаўналетніх райвыканкама, аддзялення ДАІ і інспекцыі па справах непаўналетніх РАУС, а таксама раённага грамадскага аб’яднання “Белая Русь”. Дзед Мароз, а ў яго ролі выступіў старшы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Іван Пачкоўскі і Снягурачка – першы сакратар райкама БРСМ Юлія Протас – дарылі хлопчыкам і дзяўчынкам салодкія ласункі, цукеркі і цацкі. Дзеці з радасцю чыталі для казачных герояў вершы, абяцалі слухаць сваіх бацькоў, выхавацеляў і настаўнікаў. Вучыцца толькі на “выдатна”.

## Спаборнічалі за званне лепшай пярвічкі

28 лютага актавая зала СШ №1 была запоўнена поўнасцю – тут праходзіў раённы конкурс на лепшую пярвічную арганізацыю ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” сярод школьнікаў. Спаборнічалі вучні 8-11 класаў СШ №1, Германавіцкай, Лужкаўскай СШ, Зоркаўскай БШ.

“Школьны марафон” – а менавіта так называлася мерапрыемства – быў прысвечаны Году моладзі. Яго арганізатарамі выступілі аддзел адукацыі, спорту і турызму райвыканкама і райкам БРСМ Юлія Протас.

Марафон распачаўся конкурсам-прывітаннем “Знаёмцеся, гэта мы!”. Школьнікі ў вершах, песнях, танцах, сцэнках і слайдшоў расказалі пра дзейнасць сваіх пярвічных арганізацый, іх гісторыю і традыцыі, пераемнасць і сувязь пакаленняў. Юныя актывісты БРСМ прадэманстравалі максімум знаходлівасці і акцёрскіх здольнасцей, за што атрымалі ад журы вялікую колькасць “пяцёрак”. Максімальныя адзнакі выстаўлены школьнікам з СШ №1, Германавіцкай СШ. Далей прайшоў конкурс агітацыйных брыгад. Каманды-ўдзельніцы паказалі цікавыя тэматычныя нумары, мэтай яукіх было расказаць пра плюсы ўступлення ў БРСМ. Найлепш гэта зрабілі вучні з Лужкаўскай СШ і Зоркаўскай БШ.

Завяршыліся творчыя спаборніцтвы “Дамашнім заданнем”. Кожная каманда прадставіла на суд журы і гледачоў відэаролікі гумарыстычнага характару, якія адлюстроўвалі адзін дзень з жыцця пярвічнай арганізацыі. Найбольш змястоўны і арыгінальны ролік, на думку журы, атрымаўся ў вучняў з Германавіцкай СШ.

Найвышэйшую суму балаў па выніках усіх іспытаў атрымала каманда актывістаў з Германавіцкай СШ, другое месца заняла дружына СШ №1, трэцяе месца падзялілі паміж сабою Лужкаўская СШ і Зоркаўская БШ.

Усім дзякуй за ўдзел і грунтоўную падрыхтоўку, якая была праведзена напярэдадні, -- падвяла вынікі Юлія Протас. – асабліва радуе. Што адгукнуліся і прыехалі сельскія школы. Падкрэслю, што абсалютна ўсе каманды выступілі на высокім узроўні і кожны можа лічыць сябе пераможцам. Вельмі прыемна было назіраць за выступленнямі, якія адкрылі вас з новага боку, дапамаглі праявіць творчыя і лідарскія здольнасці.

Прызёры спаборніцтва ўзнагароджаны дыпломамі і салодкімі пачастункамі.

27 сакавіка ў Шаркаўшчынскай СШ №2 адбудзецца міжрэгіянальны этап “Школьнага марафону”. Дзе сваю творчасць прадставяць каманды пераможцы Браслаўскага, Глыбоцкага, Міёрскага, Пастаўскага раёнаў, ад Шаркаўшчынскага раёна выступяць актывісты БРСМ з СШ №1 і Германавіцкай СШ.

**Моладзь за чысціню гарадоў і сёл**



Удзельнікі валанцёрскага лагера пярвічнай арганізацыі БРСМ Шаркаўшчынскай сярэдняй школы № 2 і вучань Германавіцкай сярэдняй школы Аляксандр Фёдараў увайшлі ў лік пераможцаў рэспубліканскага конкурсу “Моладзь за чысціню гарадоў і сёл”, які на працягу мінулага года праходзіў па ўсёй краіне і аб’яднаў сотні юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Час для добрых спраў працягваецца. “Існуе такое правіла. Прачнуўся, памыўся, прывёў сябе ў парадак – і адразу ж прывядзі ў парадак сваю планету” – з гэтымі словамі Маленькага прынца з аповесці Антуана дэ Сэнт-Экзюперы згодны многія маладыя абаронцы прыроды, дзякуючы дзейнасці якіх у мінулым годзе былі арганізаваны і праведзены шматлікія аперацыі па азеляненню нашага гарадскога пасёлка, а таксама рэйды па збору смецця. “Моладзь за чысціню гарадоў і сёл” – экалагічная акцыя, якая не першы год праходзіць у нашым раёне. Вось і на гэты раз яна была праведзена арганізавана і зладжана. З ранняй вясны і да позняй восені вучні Шаркаўшчынскай сярэдняй школы № 2 пад кіраўніцтвам настаўніцы біялогііАксаны Паўлаўны Пачэпка займаліся добраўпарадкаваннем прышкольнай тэрыторыі, ачышчалі ад смецця парк сельгастэхнікі і берагавыя лініі рэк Дзісна і Янка, праводзілі азеляненне гарадскога пасёлка і саджалі дрэвы. Не засталіся без увагі маладых людзей і помнікі загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны воінам. Акрамя непасрэднага ўдзелу ў мерапрыемствах па навядзенні парадку на зямлі, школьнікі ставілі перад сабой мэту прыцягнуць увагу насельніцтва да экалагічных праблем. І,трэба адзначыць, гэта ў іх нядрэнна атрымалася: усё больш шаркаўчан становяцца ўдзельнікамі экалагічных акцый і праектаў, арганізатарамі якіх выступаюць вучні і настаўнікі сярэдняй школы № 2.



“Кардынальна змяніць гэты свет мы не можам. Але нават калі хоць адзін двор стане чыстым і прыгожым – гэта ўжо нямала. І давайце памятаць аб тым,што добрыя справы патрэбны не ў рамках пэўнай акцыі ці праекта, добрыя справы патрэбны заўсёды”, – упэўнены ўдзельнікі валанцёрскага лагера Шаркаўшчынскай сярэдняй школы № 2, якія па выніках рэспубліканскага конкурсу “Моладзь за чысціню гарадоў і сёл” заваявалі 2 месца ў намінацыі “Лепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод вучнёўскай моладзі.” У ліку прызёраў рэспубліканскага конкурсу – Аляксандр Сайкоўскі, Дзмітрый Фёдараў, Павел Райчонак, Даніла Мядзюха, Святлана Паляк, Елізавета Гуляшка, Ганна Лонская, Вольга Вярховіч, Ангеліна Валашчук, Павел Сташкевіч, Багдан Тарбецкі, Яна Струй, Паліна Рачыцкая, Дзіяна Лук’янёнак, Ганна Васілеўская, Даніэла Бука, Дзмітрый Кандраценка, Алесь Шышко і Анастасія Міхнёнак. Віншуем юнакоў і дзяўчат з заслужанай перамогай і спадзяёмся, што іх добрыя справы будуць працягвацца і ў новым 2016 годзе.

Для Аляксандра Фёдарава – вучня Германавіцкай сярэдняй школы і ўдзельніка валанцёрскага атрада пярвічнай арганізацыі БРСМ мінулы год таксама не прайшоў дарэмна. У рамках рэспубліканскага конкурсу “Моладзь за чысціню гарадоў і сёл” гэты малады чалавек зрабіў шмат добрых і карысных спраў і заваяваў 3 месца ў намінацыі “Лепшы валанцёр атрада”.

Аляксандр уваходзіць у склад школьнага экалагічнага клуба, які прымаў удзел у праекце “Малыя рэкі – вялікія праблемы”. Разам з іншымі валанцёрамі Саша праводзіў маніторынг якасці вады ў рацэ Дзісна і яе прытоках, выяўляў месцазнаходжанне несанкцыянаваных звалак смецця і ачышчаў ад яго берагавыя лініі рэк. Юны абаронца прыроды праводзіў тлумачальную работу з насельніцтвам аб неабходнасці выкідваць смецце ў адпаведных для гэтага месцах і распаўсюджваў лістоўкі, што заклікалі беражліва адносіцца да навакольнага асяроддзя. Разам з дарослымі Саша шмат працаваў падчас рэканструкцыі старадаўняга парка ў аграгарадку Германавічы, які зараз, пасля аднаўлення, стаў выдатным месцам адпачынку для вясковых жыхароў.

У якасці валанцёра атрада “Равеснік”, заснаваным раённым камітэтам БРСМ, юнак удзельнічаў у навядзенні парадку на вуліцах аграгарадка Лужкі і дапамагаў мясцовай гаспадарцы ў праполцы агародніны.Вялікая ўвага ў Германавіцкай сярэдняй школе надаецца шэфству над абеліскамі і салдацкімі пахаваннямі.Старшакласнікі даглядаюць брацкае пахаванне воінаў 166-й стралковай дывізіі ў суседняй вёсцы Жукі Ложныя, абеліск у гонар землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сквер-мемарыял у гонар воінаў 1406 зенітна-артылерыйскага палка, якія вызвалілі вёску Германавічы ад захопнікаў, пахаванні польскіх салдат, загінуўшых падчас вайны з белапалякамі 1919-1920 гадоў. Аляксандр заўсёды сярод ініцыятараў гэтай справы і сваім ўласным прыкладам заахвочвае хлопцаў і дзяўчат да ўдзелу ў акцыі “Абеліск”. У маладога чалавека асаблівае стаўленне да ветэранаў, бо яго дзядуля Аляксандр Сяргеевіч Жылко таксама быў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

Будучы валанцёрам, Саша Фёдараў зрабіў шмат патрэбных і добрых спраў, а таксама пазнаёміўся з новымі сябрамі, для якіх валанцёрская дзейнасць таксама неабходная, цікавая і карысная.

**Цветы Великой Победы**

5 августа в районном Центре детей и молодёжи прошёл вечер авторской (бардовской) песни “Цветы Великой Победы”, организатором которого стал райком «БРСМ». На него были приглашены начальник отдела идеологической работы, культуры и по делам молодёжи райисполкома Л. В. Стома, председатель районной ветеранской организации Г. Н. Филатова, представители учреждений культуры и образования, члены народного литературно-музыкального объединения «Світанок», творческая молодёжь, активисты общественного объединения «БРСМ».

Началось мероприятие с диалога поколений на тему «Год культуры в Беларуси». Участникам была предоставлена возможность обменяться мнениями, опытом, задать интересующие вопросы, рассказать о своих идеях и внести предложения по их реализации.

Продолжением диалога стал вечер авторской (бардовской) песни, который впервые прошёл в нашем районе. Анна Василевская, Анастасия Римдёнок, Елизавета Гуляшко, Вераника Василевская, Анна Чупрова, Светлана Климза, Владимир Макаров, Светлана Гирстун исполнили бардовские песни. Иван Русецкий продемонстрировал такие инструменты, как губная гармошка, блок-флейта, мелодика, сыграл и рассказал о них. Богдан и Ангелина Торбецкие не смогли присутствовать на мероприятии, поэтому они записали своё выступление на видео. «Свитанковцы» прочли присутствующим стихи, рассказали о своих творческих успехах.

Людмила Владимировна Стома предложила организовать осенью районный конкурс авторской (бардовской) песни. Творческая молодёжь с охотой заинтересовалась предложением.

В конце мероприятия первый секретарь райкома БРСМ Юлия Протас подвела итоги и наградила участников дипломами и небольшими подарками.





## БРСМ – для маладых і актыўных

— У наш імклівы час словы “моладзь” і “БРСМ” амаль што сінонімы. Дзейнасць Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі неразрыўна звязана з жыццём і інтарэсамі прадстаўнікоў пакалення NEXT. І хоць, часам, сустракаюцца на шляху маладога пакалення пэўныя цяжкасці і праблемы, яны не могуць перашкодзіць юнакам і дзяўчатам быць таленавітымі, творчымі і актыўнымі, энергічнымі і мэтанакіраванымі, здольнымі ўвасобіць у жыццё вялікую колькасць разнастайных ідэй, конкурсаў і праектаў, якіх за апошні год у нашым рэгіёне было рэалізавана вельмі шмат, - адзначыла першы сакратар раённага камітэта БРСМ Юлія Протас, якая і ўручыла ўзнагароды лепшым прадстаўнікам маладзёжнага саюза падчас правядзення ўрачыстасці ў раённым Цэнтры культуры. На мерапрыемстве у гэты дзень былі падведзены вынікі работы па рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў раёне.

За актыўны ўдзел у рэалізацыі праграм і праектаў Грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” Граматамі Віцебскай абласной арганізацыі ГА “БРСМ” узнагароджаны: Надзея Булкіна – сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Шаркаўшчынскай СШ № 1, Дар’я Цярэнцьева – сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Іёдскай дзіцячы сад-сярэдняя школа, Сняжана Рубніковіч – вучаніца Германавіцкай СШ, Ксенія Міхнёнак – вучаніца Шаркаўшчынскай СШ № 2, Павел Сташкевіч – вучань Шаркаўшчынскай СШ № 2.



Граматамі Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі Грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" ўзнагароджаны актыўныя ўдзельнікі маладзёжнага саюза сярод працоўнай моладзі: Марыя Седзюкевіч, Вадзім Казлоўскі, Анна Зайцава, Таццяна Лаздоўская, Іван Русецкі, Таццяна Крыўко, а таксама актывісты БРСМ з ліку навучэнцаў школ: Паліна Вярыга, Кацярына Сайкоўская, Станіслаў Ластаўка, Караліна Мароз, Уладзіслаў Шынкевіч (Шаркаўшчынская СШ № 1), Аксана Шуман (Лужкаўская СШ) і Андрэй Рубніковіч (Германавіцкая СШ).

Граматай і памятным падарункам за актыўны ўдзел у "Працоўным семестры-2015" і абласным конкурсе "Моладзь за чысціню гарадоў і сёл" узнагароджана пярвічная арганізацыя БРСМ Лужкаўскай сярэдняй школы. А за актыўны ўдзел у раённых, рэгіянальных і абласных мерапрыемствах і конкурсах маладзёжнага грамадскага аб'яднання падчас урачыстасці салодкімі падарункамі былі адзначаны пярвічныя арганізацыі Шаркаўшчынскай СШ № 1, Шаркаўшчынскай СШ № 2 і Германавіцкай сярэдняй школы. Віншуем юнакоў і дзяўчат з заслужанымі ўзнагародамі!



**Дерево Великой Победы”**

23 апреля в рамках республиканского субботника по инициативе директора средней школы № 1 Сергея Ганебного членами Молодёжной палаты района и активом первичной организации Белорусского республиканского союза молодёжи проведена посадка плодового сада на территории учебного заведения. Проведение данной акции “Дерево Великой Победы” состоялось в рамках республиканского проекта “Цветы Великой Победы”. 44 яблони и 6 груш, посаженные в тот день, стали дополнением к уже существующим зонам отдыха возле СШ № 1. И уже через 3-4 года яблони и груши дадут свои первые ароматные и сочные плоды.



## Дапамаглі сцены роднай школы

Членаў самай масавай грамадскай арганізацыі нашай краіны, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, заўсёды вылучаюць творчасць, актыўнасць і ініцыятыўнасць. У гэтым у чарговы раз можна было ўпэўніцца 15 сакавіка, калі на базе Шаркаўшчынскай сярэдняй школы № 2 прайшоў конкурс на лепшага лідара пярвічнай арганізацыі “Лідар — новае пакаленне”. Вядучыя праграмы, а ў іх ролі выступілі вучні СШ № 1 гарпасёлка Лізавета Зорына і Макар Пундзіс, прадставілі гледачам канкурсантаў. Імі сталі Павел Сташкевіч (СШ № 2), Юлія Гірстун (СШ № 1), Дар’я Цярэнцьева (Іёдская ДС-СШ), Карына Мядзелец (Германавіцкая СШ) і Аксана Шуман (Лужкаўская СШ).




У першым конкурсным этапе “Мая грамадзянская пазіцыя” трэба было як мага ярчэй адлюстраваць свае творчыя здольнасці, захапленні, свой асабісты ўклад у жыццё школьнай пярвічнай арганізацыі БРСМ. Дарэчы, па ўмовах конкурсу журы не ставіла балы ўдзельнікам на прамежкавых этапах, каб як мага болей заінтрыгаваць гледачоў, а ў першую чаргу, саміх “лідараў” і каманды іх падтрымкі. Другі этап — інтэрактыўная гульня “Дэбаты”. Канкурсанты на працягу адной хвіліны са сцэны вялі маналог-разважанне на тэму “захоўваем традыцыі, жывём сучаснасцю”. А на завяршальным і, напэўна, самым цікавым этапе “Дуэт лідараў”, бо падчас яго бурна апладзіравалі прысутныя гледачы, удзельнікі выступалі разам са сваімі настаўнікамі. Тут з іншага боку паказалі сябе педагогі. Яны з гумарам, артыстызмам і акцёрскім запалам дапамагалі сваім падапечным дастойна вытрымаць конкурсны этап і атрымаць перамогу ў спаборніцтве.



Пасля доўгага абмеркавання журы вызначыла пераможца конкурсу “Лідар — новае пакаленне”. Ім стаў Павел Сташкевіч. У дадзеным выпадку вельмі дарэчы будзе сказаць, што сцены роднай школы дапамаглі яе вучню стаць “лідарам”. На другім месцы — Карына Мядзелец, на трэцім — Дар’я Цярэнцьева. Дыпломы за актыўныўдзел у конкурсе атрымалі Аксана Шуман і Юлія Гірстун.

**Акция “Стоп, СПИД!”**

Всемирный день борьбы со СПИДом отмечается 1 декабря с 1998 года и объединяет людей со всего мира в стремлении повысить осведомленность об эпидемии ВИЧ-инфекции и поддержать, в знак солидарности миллионы людей, живущих с ВИЧ.

1 декабря совместную акцию «Стоп, СПИД!» на улицах горпосёлка провели райком БРСМ и районный Центр культуры. Первый секретарь ОО «БРСМ» Юлия Протас и художественный руководитель РЦК Татьяна Кривко проинформировали и раздали брошюры, которые направлены на повышение знаний о ВИЧ-инфекции, а также популяризацию принципов здорового образа жизни населения. Информационный материал для проведения акции предоставлен Шарковщинским Центром гигиены и эпидемиологии.



**XXX справаздачна-выбарная канферэнцыя Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі ГА “БРСМ”**




5 красавіка адбылася 30-я справаздачна-выбарная канферэнцыя Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”. На ёй былі падведзены вынікі работы за 2014—2016 гады, абраны новыя прадстаўнікі ў склад раённага камітэта і кантрольнай камісіі, вызначаны дэлегаты на справаздачна-выбарную канферэнцыю Віцебскай абласной арганізацыі БРСМ, а таксама прыняты і зацверджаны зварот дэлегатаў канферэнцыі да моладзі Шаркаўшчынскага краю. Пасля абмеркавання выступленняў дакладчыкаўработа раённай арганізацыі была ацэнена станоўча, а лепшыя прадстаўнікі моладзі нашага раёна, якія займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, раздзяляюць ідэі маладзёжнага саюза і рэалізуюць іх на практыцы, былі ўзнагароджаны граматамі і падзякамі за паспяховую дзейнасць. Старшыня Шаркаўшчынскага раённага выканаўчага камітэта Мікалай Ірынархавіч Баговіч адзначыў актыўную работу і ўручыў Падзякі намесніку дырэктара па клубных установах раённага цэнтра культуры Таццяне Лаздоўскай і педагогу-арганізатару Шаркаўшчынскай СШ № 2 Ірыне Цыунэль.




Першы сакратар Віцебскай абласной арганізацыі ГА “БРСМ” Віктар Валер’евіч Глушын падчас свайго выступлення адзначыў высокі ўзровень, на якім у нашым рэгіёне праводзяцца мерапрыемствы па рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, і асабліва падкрэсліў той факт, што ў Шаркаўшчыне — лепшы тандэм маладзёжнай арганізацыі БРСМ і раённага выканаўчага камітэта.

Дзякуючы плённаму супрацоўніцтву органаў мясцовай улады і раённага камітэта, за справаздачны перыяд у раёне было рэалізавана шмат цікавых праектаў для моладзі, у тым ліку і абласнога ўзроўню. За садзейнічанне ў рэалізацыі праектаў і праграм Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Ганаровымі граматамі Віцебскай абласной арганізацыі ГА "БРСМ" узнагароджаны бухгалтар Шаркаўшчынскай ЦРБ Юлія Лук'янёнак, настаўнік Більдзюжскай сярэдняй школы Вадзім Казлоўскі, участковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх РАУС Іван Мацкевіч, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Шаркаўшчынскай СШ № 1 Ядзвіга Вітальеўна Балай і дырэктар Зоркаўскай БШ Мая Яўгенаўна Якімовіч. Сярод узнагароджаных Падзячнымі лістамі і падарункамі Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі ГА "БРСМ" – пярвічныя арганізацыі школ гарадскога пасёлка, Германавіцкай, Лужкаўскай, Більдзюжскай, Іёдскай сярэдніх і Зоркаўскай базавай школ, а таксама УА "Шаркаўшчынская СШ № 2", фізкультурна-спартыўны клуб "Шаркаўшчына" і раённы Цэнтр культуры.

Асаблівыя словы ўдзячнасці падчас справаздачна-выбарнай канферэнцыі прагучалі ў адрас першага сакратара Шаркаўшчынскага раённага камітэта ГА "БРСМ" Юліі Леанідаўны Протас, якая ўзначальвала маладзёжную арганізацыю раёна на працягу трох з паловай гадоў. Дзякуючы ёй у нашым раёне было рэалізавана шмат цікавых спраў, праектаў і праграм, было адзначана падчас урачыстасці. Быць маладзёжным лідарам – няпроста. А стаць сапраўдным лідарам для моладзі цэлага рэгіёну – справа, якая па сілах не кожнаму. Юлія – менавіта такі чалавек, творчы і рознабаковы, дзякуючы ёй, многія мерапрыемствы ў Шаркаўшчынскім раёне праводзіліся на самым высокім узроўні. Ад імя аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама начальнік аддзела Людміла У Уладзіміраўна Стома і яе намеснік Ігар Афанасьевіч Іваноў на памяць аб сумеснай плённай працы са словамі ўдзячнасці і найлепшымі пажаданнямі ўручылі першаму сакратару Падзячнае пісьмо і сувенір, зроблены супрацоўнікамі раённага Цэнтра рамёстваў. Гучныя апладысменты ў адрас першага сакратара прагучалі ў гэты дзень ад моладзі ўсяго рэгіёнуа.

Вынікі падведзены і планы акрэслены. Дзякуючы таленавітай і творчай моладзі, Шаркаўшчынская раённая арганізацыя ГА "БРСМ" будзе развівацца і расці. Наперадзі ў яе – шмат цікавых спраў і праектаў.

**Шарковчане пополнили ряды молодёжных общественных организаций**

Церемония торжественного вступления в ряды октябрят, общественных организаций «Белорусская республиканская пионерская организация» и «Белорусский республиканский союз молодежи» состоялась в мае на базе Шарковщинской средней школы № 2.

На мероприятии присутствовали председатель районного совета ветеранов педагогического труда Ядвига Болеславовна Червинская, исполняющая обязанности секретаря райкома БРСМ Анна Михайловна Зайцева.

Вот уже 95 лет прошло с тех пор, как первые мальчишки и девчонки нашей страны повязали красные галстуки и стали называть себя пионерами.

С каждым годом и пополняется новыми энергичными ребятами Белорусская республиканская пионерская организация. Торжественную линейку было решено начать с принятия самых младших ребят, будущих октябрят. Ведь именно они — будущая смена сегодняшним пионерам. Произнеся торжественное обещание и получив заветный значок, второклассники стали носить гордое звание — октябренок.

Ряды ОО «БРПО» в этот день пополнили 30 школьников, около 20 юношей и девушек стали членами ОО «БРСМ».

Ядвига Болеславовна Червинская поздравила всех с вступлением в ряды общественных организаций района.

К поздравлениям присоединилась Анна Зайцева, которая вручила значки и членские билеты БРСМ, а также выпускникам школы рекомендации общественного объединения «БРСМ» для поступления в высшее учебное заведение.



**Юные шарковчане пополнили ряды общественных молодёжных организаций**

Торжественная линейка, посвящённая приёму в ряды молодёжных общественных объединений «Белорусская республиканская пионерская организация» и «Белорусский республиканский союз молодёжи», состоялась 18 мая, на базе средней школы № 2.

Представители юного поколения нашего района пообещали любить свою родину, быть добрыми, честными и справедливыми**.**

В этот погожий майский день настроение у ребят было прекрасное. И потому важный шаг в своей жизни они делали с особым энтузиазмом и блеском в глазах. А это, как известно, очень важно в любом начинании. Ряды ОО «БРПО» в этот день пополнили 20 школьников, 20 юношей и девушек стали членами ОО «БРСМ». В адрес ребят, начавших пионерский маршрут в страну открытий и знаний, добрых дел, было произнесено много напутствий и прекрасных пожеланий. Пионеров и молодёжь поздравила бывший директор второй школы Ядвига Болеславовна Червинская:

— От имени старшего поколения поздравляю вас со вступлением в пионеры и БРСМ. Вы являетесь приемниками пионерской организации нашей юности и всесоюзной комсомольской организации. В годы войны и в послевоенное время пионеры и комсомольцы совершили подвиг, сражаясь в тылу и на фронтах за мирное небо, занимаясь восстановлением народного хозяйства на ровне со взрослыми. Пионеры и комсомольцы во все времена были патриотами. Поэтому хотелось, чтобы вы были продолжателями и традиций и достойными строителями нашего общества, нашей любимой республики. К поздравлениям присоединилась первый секретарь райкома «БРСМ» Юлия Протас:

— Вступление в члены общественных объединений очень ответственный шаг. Впереди у каждого юного участника сегодняшнего торжества много возможностей, и, я надеюсь, что вы сможете их достойно реализовать. Желаю вам быть настоящими гражданами своей страны, патриотами, активными участниками значимых событий, происходящих в нашем районе. Звёздных вам побед, творческого вдохновения и молодёжного задора.





Писатель Кириллов Герман Илларионович,
Первый секретарь Шарковщинского РК КПБ,
на встрече с учащимися восьмилетней школы
*1960* год




Республиканская комсомольская школа
при ЦК ЛКСМБ
г. Минск
Январь *1973* г.



Выступает Трабо Г.Н. – зав. отделом пропаганды райкома партии
Семёнов Е.Ф. – первый секретарь РК ЛКСМБ
Осипенко Я.И. – ветеран
Болевая В.С. – секретарь Витебского обкома комсомола
Тимофеев В.И. – второй секретарь РК ЛКСМБ
Михедко Л.К. – секретарь по школам
*1975* г.
Пленум РК ЛКСМБ



Суворов Владимир – Первый секретарь РК ЛКСМБ
Безуматов Валерий – заведующий организационным отделом
Баслак Ядвига – заведующая школьным отделом
Курилович Галина – заведующая сектором учёта
Лялеко Лилия – секретарь-машинистка

*1966* год



Михедко Лариса награждается грамотой за активное участие в комсомольской жизни.
*100*-летие В.И. Ленина,
Колхоз имени Фрунзе.
*1970* год




Делегаты от Шарковщинского района
на XIX Областную Комсомольскую
Конференцию

*11* декабря *1975* г.



Сикоро О.И. – заведующая отделом по работе со школами
Савейко С.М. – директор дома пионеров
Циркина В.И. – методист по воспитательной работе РОНО

Районный пионерский слёт,



Митинг, посвящённый Дню рождения пионерской организации



Торжественный Пленум районной пионерской организации.
Выступает лучшая вожатая района – Котович Л.М. (Германовичская СШ)

# Список литературы


1. Адобрана праграма дзеянняў: [чарговы пленум раённага камітэта БРСМ] // Кліч Радзімы. – 2009. – 11 лютага (№9). – С.1.

2. Акция «Не дай себя обмануть»: [профилактика преступлений в отношении граждан престарелого возраста] // Кліч Радзімы. – 2016. – 24 сентября (№54). – С. 2.

3. БРСМ – правапераемнік камсамола: [справаздачна-выбарная канферэнцыя Шаркаўшчынскай раённай арганізацыі БРСМ] // Кліч Радзімы. – 2008. – 8 мая (№27). – С. 2.

4. БРСМаўцы пра камсамол: [да 85-годззя ЛКСМБ] // Кліч Радзімы. – 2005. – 15 кастрычніка (№63). – С.3.

5. Казлоўская, Л. Камсамольцы – перадавікі калгаса / Л. Казлоўская // Калгасны шлях. – 1952. – 3 лістапада (№73). – С.3.

6. Каралёва, І. БПСМ напярэдадні рэформ / І. Каралёва // Кліч Радзімы. – 2002. – 28 ліпеня (№73). – С. 3.

7. Кукуць, А. Ёсць такая арганізацыя – БПСМ / А. Кукуць // Кліч Радзімы. – 1997. – 27 снежня (№135). – С. 1.

8. Лаўрыновіч, А. БПСМ вызначае арыенціры / А. Лаўрыновіч // Кліч Радзімы. – 2000. – 17 мая (№58). – С. 2.

9. Лысёнак, П. У цяжкія дні вайны [з успамінаў былога сакратара Шаркаўшчынскага падпольнага РК ЛКСМБ] / П. Лысёнак // Калгасны шлях. – 1960. – 24 верасня. – С.3.

10. Машэкіна, В. У падарунак з’езду / В. Машэкіна // Калгасны шлях. – 1962. – 14 красавіка (№33). – С.2.

11. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 510 с., іл.

12. Рабіза Г. Справы камсамольцаў раёна / Г. Рабіза // Калгасны шлях. – 1958. – 10 кастрычніка (№68). – С.3.

13. Райчонак, С. БРСМ – для маладых і актыўных / С. Райчонак // Кліч Радзімы. – 2016. – 1 чэрвеня (№68). – С. 2.

14. Сувораў, У. Ідэйная загартоўка моладзі / У. Сувораў // Кліч Радзімы. – 1969. – 4 красавіка (№25). – С.2.

15. Фёдарава, М. За чысціню мары / М. Фёдарава // Кліч Радзімы. – 2010. – 17 красавіка (№35). – С.3.